№№65–66
(2793–2794)

1 мая 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

# Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог*
*Выхадзі, мой народ, грамадою...*

**Якуб КОЛАС**

**Да ўвагі!**
**Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!**

*Шаноўныя чытачы!*
*Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.*

**ДЭМАКРАТЫЯ ПА-БЕЛАРУСКУ**

# Дзе працаваць і як пісаць, я буду вырашаць сам

*Журналіст "Народнай волі" даведаўся на ўласным вопыце, што трэба зрабіць для таго, каб апынуцца ў міліцыі.*

Для гэтага дастаткова выйсці ў цэнтр Мінска і паназіраць, як маладзёжныя актывісты на чале са старшынёй Аб'яднанай грамадзянскай партыі раздаюць **Пасланне грамадзяніну, бізнесу і дзяржаве**, якое было прынята на чарговым з'ездзе АГП і якое было надрукавана ў адным з мінулых нумароў"Народнай волі". Што я і зрабіў...

## Пасланне партыі

Выконваючы рэдакцыйнае заданне, я разам з Анатолем Лябедзькам, Віталем Стажаравым, Мікалаем Сяргеенкам, Кірылам Паўлоўскім пайшоў на праспект Незалежнасці ў раён ГУМа. Тут дэмакраты мусілі распаўсюджваць Пасланне Аб'яднанай грамадзянскай партыі, надрукаванае ў "Народнай волі".

...Яшчэ каля станцыі метро "Купалаўская" мы заўважылі за сабой "хвост". Спусціўшыся ў падземны пераход, Анатоль Лябедзька жартам пацікавіўся ў спецназаўца: "Ну што, перадалі? Мы ж у краму ідзём..." Не ведаў Анатоль Уладзіміравіч, што літаральна праз пятнаццаць хвілін гэты ж самы малады чалавек будзе настойваць на тым, каб Лябедзька праехаў з ім...

Так супала, што Пасланне сябры АГП распаўсюджвалі ў той самы дзень і гадзіну, калі са штогадовым Пасланнем да Нацыянальнага сходу і беларускага народа звяртаўся Аляксандр Лукашэнка. Радавала тое, што 200 экземпляраў "Народнай волі" разышліся літаральна за некалькі хвілін. Людзі прасілі дадатковыя асобнікі. Пасля таго, як амаль усе газеты былі раздадзены, мы вырашылі перайсці на другі бок праспекта. Не заўважыць, што да нас "прыклеіўся" агент у цывільным, было немагчыма.

На другім баку праспекта, каля будынка Нацбанка, нас ужо чакалі двое спецназаўцаў. Хлопцы, якія толькі што раздавалі газеты, прадумвалі варыянты адыходу... Я ведаў, што нікуды збягаць не буду, бо нічога супрацьзаконнага не зрабіў: я выконваў свой прафесійны абавязак — фатаграфаваў тое, як актывісты Аб'яднанай грамадзянскай партыі знаёмяць людзей з Пасланнем, надрукаваным у "Народнай волі".

Такім чынам нас узялі ў "каробачку" — спераду набліжаліся двое спецназаўцаў, ззаду нас кантралявалі людзі ў цывільным.

Ці варта казаць, што спецназаўцы не назвалі сябе? На настойлівую просьбу назваць імя і прозвішча яны адказвалі: *"Мы прадставіліся, калі падыходзілі"*. Праз колькі хвілін яны паглядзелі нашыя дакументы і вымавілі: *"Вам трэба праехаць з намі"*. Што супрацьзаконнага зрабіў Лябедзька з калегамі, спецназаўцы не патлумачылі. У сваю чаргу расказваць, што я *"не з імі"*, было бессэнсоўна — на журналісцкае пасведчанне ніхто ўвагі не звяртаў: *"Садзіся, у аддзяленні разбяруцца..."* Тут жа падагналі ўазік і "Газель". І мы паехалі...

## «Калі б у мяне зарплата была пяць мільёнаў, то я пачаставаў бы цябе курыцай-грыль прама ў пастарунку»

Яшчэ ў машыне адзін са спецназаўцаў прасіў, каб мы перасталі размаўляць па мабільніках. Але нічога ў яго не атрымалася, і інфармацыю пра затрыманне я паспеў паведаміць калегам.

Адразу пасля прыезду нас завялі ў кабінет на першым паверсе. Тут, акрамя нас, знаходзіўся і *"былы сяржант міліцыі Уладзімір Іванавіч"*, якога забралі ў пастарунак за п'янку і які вельмі хацеў у туалет. Прычым сваю просьбу ён звычайна суправаджаў трохпавярховай нецэнзурнай лаянкай на адрас супрацоўнікаў міліцыі і спецназа...

Спецназаўцы, што прывезлі нас, засталіся побач — за ахоўнікаў. Праз некалькі хвілін у кабінет, дзе нас утрымлівалі, прыйшоў нейкі чалавек у цывільным. *"Ну што ты нарабіў, чаму табе дома не сядзелася?"* — запытаў ён. "Я знаходжуся пры выкананні службовых абавязкаў", — адказаў я. *"Пры якім выкананні?.."* На гэтым дыялог скончыўся. Даводзіць пра "Закон аб друку", аб правах журналіста на збор інфармацыі было бессэнсоўна.

Затым у пакой увайшоў яшчэ адзін чалавек у цывільным. Як потым мне сказаў Віталь Стажараў, які *"меў гонар"* пазнаёміцца з ім раней, гэта быў намеснік начальніка Цэнтральнага РУУС спадар Грышчанка. *"Стань, нормальна, корреспондент! Что ты улыбаешься?"* — сапраўды, Грышчанка паводзіў сябе так, як быццам ён цар і бог. Было зразумела, што ад гэтага чалавека, культура якога не на высокім узроўні, залежыць, што будзе з намі далей — павесяць ці расстраляюць...

Тым часам у нас забралі дакументы і мабільныя тэлефоны, абшукалі з ног да галавы — нават шкарпэткі памацалі. Загадалі таксама пакласці на стол фотаапарат. Лябедзьку, які папрасіў службістаў прадставіцца, забралі ў асобны кабінет. Шчыра кажучы, падумаў, што яго будуць біць... Але, дзякуй Богу, абышлося.

Што будзе з намі, таксама было невядома. Асабіста я рыхтаваўся да "сутак", бо ў пратаколе, калі б ён быў складзены, можна было б напісаць, што я, напрыклад, лаяўся матам на... фотаапарат. Падобных прыкладаў процьма...

Пакуль недзе там, наверсе, вырашалася, што з намі рабіць, мы бавілі час у размове са спецназаўцамі. Яны падаліся абсалютна нармальнымі людзьмі, у якіх проста праца такая. Варта адзначыць, што ніводнага брыдкага слова ў наш адрас яны не сказалі. Не было і ўжывання фізічнай сілы. *"О, "Народная воля" піша пра ўрок футбола, быццам бы Нявыглас яго ўводзіць"*, — ажывіўся адзін. Далей, размова па душах выйшла на новы ўзровень — як цяжка жыць спецназаўцу. *"Вось вы пішаце, у сваёй друкаванай прадукцыі, што ў спецназаўца заробкі па пяць-восем мільёнаў,* — казаў мне спецназавец. — *Ды калі б так было, павер, я б цябе курыцай-грыль у пастарунку пачаставаў... Я зарабляю, як электрык на заводзе, — няшмат. Закон аб адмене льгот і нас закрануў. Зараз я павінен за свой кошт затрыманага ў пастарунак везці, калі, напрыклад, транспарту няма... Праязныя пакуль не далі..."*

Потым мы абмеркавалі малакількасную удзельнікаў "Чарнобыльскага Шляху", прыгаворы па "справе 14-ці", колькасць сябраў АГП. На тым і развіталіся, бо спецназаўцы спазняліся на абед: есці — справа святая, асабліва калі з 6.30 ранку нялёгкую службу нясеш... На развітанне адзін са спецназаўцаў прызнаўся: *"Зараз цябе, карэспандэнт, выпусцяць... Пойдзеш ізноў усё фатаграфаваць? Лепш бы ты ў часопісе "Максім" працаваў, ці ў "Мурзілцы", альбо ў газеце "На страже"...*

## «Делай выводы, корреспондент»

Прыкладна праз тры гадзіны нас сталі *"выдёргивать"* з кабінета па аднаму. Першага забралі Віталя Стажарава. Вярнуўшыся, хлопец паведаміў, што яго вадзілі *"здымацца на камеру"*. *"Ну ўсё, пачалася доўгая дарога на суткі,* — падсумаваў Мікалай Сяргеенка. — *Мяне перад "Сацыяльным маршам" за распаўсюджванне інфармацыі на 10 сутак "закрылі"*. Аднак, крыху пазней стала зразумела, што нас выпускаюць па аднаму. На развітанне намеснік начальніка Цэнтральнага РУУС — той самы агрэсіўны Грышчанка —сказаў мне: *"Делай выводы, корреспондент"*. Больш за тое, мне параілі змяніць месца працы.

Не дачакаецеся, таварыш Грышчанка! Дзе працаваць і як пісаць, я буду вырашаць сам!

Хаця я, можна сказаць, выслізнуў з рук міліцыі лёгка, бо Анатолю Лябедзьку ў пастарунку ўвогуле параілі знікнуць. *"Як мне падалося, Грышчанка хацеў справакаваць мяне на бойку. Аднак, калі нічога не атрымалася, ён мне сказаў: "Вам лепш знікнуць". Як гэта расцэньваць — як пагрозу ці пажаданне, — я не ведаю, аднак ведаю дакладна — я сваёй дзейнасці не спыню",* — сказаў Лябедзька пасля выхаду з пастарунка.

**Віталь ГАРБУЗАЎ.**

**Анатоль Лябедзька (другі справа) з маладымі партыйцамі пасля вызвалення з міліцыі.**

**АФІЦЫЙНА**

## *Першы візіт Дзмітрыя Мядзведзева будзе ў Казахстан*

Новы прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў пасля ўступлення на пасаду кіраўніка дзяржавы свае першыя візіты нанясе ў Казахстан і Кітай. Пра гэта паведаміў сам Мядзведзеў у гутарцы з журналістамі газеты "Аргументы и факты".

Раней паведамлялася, што Мядзведзеў прыняў запрашэнне Аляксандра Лукашэнкі і першы візіт здзейсніць у Беларусь. Некаму, мабыць, так хацелася, але жыццё дыктуе свае правілы.

**ВАС ЦІКАВІЦЬ...**

## *Якія дні зрабілі «чырвонымі»?*

**Савет міністраў Беларусі зацвердзіў перанос працоўных дзён на майскія святы.**

Працоўны дзень з панядзелка 5 мая перанесены на суботу 3-га.

Такім чынам, выхаднымі днямі будуць панядзелак 5-га (а таксама 4 мая -- нядзеля), аўторак 6 мая (Радуніца), пятніца 9 Мая, а таксама 10 і 11 мая.

**ВЫБАРЫ-2008**

## *Адфутболіла*

**На мінулым тыдні фактычна пачалася перадвыбарная кампанія.**

На сваім пасяджэнні Цэнтральная камісія па правядзенні выбараў і рэферэндумаў зацвердзіла першыя дакументы, прысвечаныя парламенцкім выбарам. Аднак ніякіх сур'ёзных крокаў дзеля таго, каб выбары прайшлі адкрыта і дэмакратычна, не прынята. Прапановы дэмакратычных сіл па правядзенні выбараў проста праігнараваны.

Старшыня ЦВК **Лідзія Ярмошына**, аднак, пацвердзіла, што прапановы апазіцыйных палітыкаў атрымала. Паводле яе меркавання, некаторыя з гэтых прапаноў не толькі супярэчаць закону, але і невыканальныя. У першую чаргу гэта тычыцца прынцыпаў фарміравання выбарчых камісій. Усім вядома, што ў іх склад прадстаўнікоў апазіцыйных партый і апазіцыйных кандыдатаў не ўключаюць. І Лідзія Ярмошына пацвердзіла, што і не будуць гэтага рабіць. Яна спасылаецца на тое, што прынцып фарміравання складу камісій пераважна з прадстаўнікоў партый супярэчыць заканадаўству. А фарміраванне камісій толькі з праўладных прадстаўнікоў, выходзіць, не супярэчыць?

Акрамя таго, ініцыятары змен прапанавалі даць права вызначаць месцы сустрэчы кандыдатаў з выбаршчыкамі не мясцовым органам улады, а акруговым выбарчым камісіям. Лідзія Ярмошына ў адказ адзначыла, што ніводная выбарчая камісія не мае ў сваёй уласнасці будынкаў, і таму, паводле яе слоў, рэалізацыя прапановы апазіцыі прывядзе да паралічу працы кандыдатаў з выбаршчыкамі.

Заяву Лідзіі Ярмошынай каментуе адзін з аўтараў праекта змен выбарчага заканадаўства, адказны сакратар Партыі БНФ, юрыст **Уладзімір Лабковіч**:

-- Адказ ЦВК ужо паказвае, што беларускія ўлады рукамі Цэнтральнага выбарчага камітэта накіраваныя на правядзенне выбараў па старым сцэнары, які прадугледжвае масавыя фальсіфікацыі выбарчага працэсу і ігнараванне міжнародных стандартаў у галіне выбарчых правоў грамадзян. Прапановы экспертаў Аб'яднаных дэмакратычных сіл Беларусі -- гэта мінімум таго, што прапаноўваюць дэмакратычныя партыі Цэнтральнаму выбарчаму камітэту для таго, каб выбары хаця б мінімальна адпавядалі як нацыянальнаму заканадаўству, так і нормам міжнароднага права. Улады яшчэ раз паказалі, што выбараў няма.

**Алег СНОЎ.**

**ЦІ ВЕДАЕЦЕ ВЫ, ШТО...**

## *Сіслач — самая забруджаная з усіх рэк*

Спецыялісты адзначаюць высокі ўзровень забруджанасці Свіслачы: на літр рачной вады прыпадае літр сцёкаў.

Пра гэта паведаміў старшыня Мінскага гарадскога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя **Аляксандр Баравікоў**. *"Я не ведаю гарадоў ні ў Еўропе, ні на постсавецкай прасторы, дзе б складвалася такая сітуацыя"*, — заявіў спецыяліст.

Паводле яго слоў, самай брудная вадой у Беларусі з'яўляецца вада ў населеным пункце Каралішчавічы, у 10 км на поўдзень ад Мінска.

**Анастасія ЯНУШЭЎСКАЯ.**

## *...И будет у нас чистая вода*

**Всемирный банк предоставит Беларуси кредит в размере 60 млн долларов на реализацию мероприятий госпрограммы "Чистая вода".**

Об этом сообщил заместитель министра жилищно-коммунального хозяйства Беларуси Сергей СУШКО на открытии выставки "Управление отходами" в Минске, сообщила БЕЛТА.

По его словам, соглашение, определяющее условия кредитования Беларуси, уже подготовлено. Кредит в 60 млн долларов будет направлен на выполнение 22 проектов госпрограммы "Чистая вода" по строительству новых и модернизации действующих объектов водоснабжения в Беларуси. В нынешнем году на выполнение заданий программы "Чистая вода" из республиканского бюджета будет направлено 120 млрд белорусских рублей, а в целом объем финансирования проекта на 2006--2010 годы составляет 700 млрд белорусских рублей.

**ГРОМКОЕ ДЕЛО**

# Прокурор попросил для кардиохирурга Александра Шкета семь лет лишения свободы

*В суде Московского района Минска близится к финалу одно из самых громких дел, связанных с белорусскими медиками*

Напомним, что с января 2008 года в суде Московского района Минска слушается дело известного в Беларуси кардиохирурга, заведующего 2-м кардиохирургическим отделением РНПЦ "Кардиология" Александра Шкета и бывшего заместителя директора фирмы "Мулитимедицин" Игоря Васюкевича.

Уголовное дело в отношении обвиняемых было возбуждено в мае прошлого года. По делу проходили еще два человека. Но коллега Александра Шкета Сергей Балашко в мае 2007 года покончил жизнь самоубийством, а директор УП "Баст" Борис Вайтман также не дожил до суда, умерев от сердечного приступа.

Александра Шкета обвиняют в мошенничестве, взяточничестве и злоупотреблении служебными полномочиями. Игоря Васюкевича — в мошенничестве, злоупотреблении служебными полномочиями и незаконной предпринимательской деятельности.

Александр Шкет своей вины не признал. Он, к слову, не переставал оперировать и во время судебного процесса. Игорь Васюкевич согласился только с тем, что реализовывал расходные материалы без соответствующей лицензии Министерства здравоохранения Беларуси.

Эпизоды, которые рассматривались в суде, касались 2001—2003 годов. За это время Александр Шкет провел более тысячи операций на сердце. Но обвинить его во взяточничестве решились только несколько человек. Зачастую это даже не бывшие пациенты кардиохирурга, а их близкие родственники. И почти все они не являются жителями Минска.

В защиту доктора выступили его коллеги и пациенты. Во время судебных слушаний в канцелярию суда было передано обращение пациентов центра, которое подписали более 80 человек, среди них — народные артисты Беларуси, лауреаты специальных премий президента, кандидаты и доктора наук.

В ходе судебных слушаний в качестве свидетелей были допрошены бывший директор РНПЦ Николай Манак и бывший заместитель центра по хирургии Юрий Островский. Оба свидетеля пояснили, что в начале 2000-х годов в центре действительно существовал хронический дефицит расходных материалов: не хватало оксигенаторов, искусственных клапанов, шовного материала, клапанов сердца. По словам Юрия Островского, о ситуации в центре знали в Министерстве здравоохранения, которое и издало распоряжение, разрешающее закупку расходного материала за счет пациентов. Однако наказать решили не чиновников, а медиков.

Накануне прений в суде защита Александра Шкета утверждала, что согласится только с одним решением суда — полным оправданием Александра Шкета. Бывшие пациенты доктора, присутствующие практически на всех судебных заседаниях, говорили, что доказать вину Шкета в суде гособвинению не удалось ни по одному эпизоду. Кто-то вспоминал первое дело кардиохирургов, которое слушалось тоже в суде Московского района Минска в 2005 году. Тогда на скамье подсудимых были три доктора РНПЦ "Кардиология" и два представителя коммерческих структур. И тогда в ходе судебных слушаний медики, во-первых, сами признали свою вину по некоторым эпизодам, во-вторых, обвинению удалось доказать, например, что в некоторых случаях кардиостимуляторы, которые имелись в наличии в клинике, были списаны, а затем проданы пациентам. В ходе второго дела медиков подобные факты не были установлены. Но...

29 апреля прокурор фактически поддержал обвинения, выдвинутые в ходе следствия, и попросил осудить Александра Шкета на 7 лет лишения свободы, а Игоря Васюкевича — на 4 года. К слову, Игорь Васюкевич проходил по делу кардиологов и в 2005 году. Все эпизоды того уголовного дела тоже касались платных операций на сердце, которые были выполнены в РНПЦ "Кардиология" в период с 2001-го па 2003 год. Васюкевич был осужден на 3 года лишения свободы. 14 месяцев предприниматель провел за решеткой, после чего меру пресечения ему изменили на исправительные работы. Выходит, по сути его за одно и то же судят дважды?

Каким будет приговор и сколько потребуется времени для его вынесения, не известно. Дело сложное, включает в себя большое количество эпизодов. 3 года назад, чтобы вынести вердикт по делу кардиологов, суду потребовалось около месяца. Тогда обвиняемые врачи и представитель коммерческой структуры "Мулитимедицин" получили разные сроки наказания: от 3 лет лишения свободы до 3,6 года исправительных работ. Причем тогда суд полностью поддержал государственное обвинение и осудил всех фигурантов дела на те сроки, которые затребовала прокуратура.

Неужели так произойдет и на этот раз?

### Звонок в РНПЦ "Кардиология"

Мы были первыми, кто сообщил коллегам Александра Шкета о том, что прокурор попросила осудить хирурга на семь лет лишения свободы. Реакция была мгновенной.

— Этого не может быть! — первое, что мы услышали в трубке. — Если Шкета отправят за решетку, кто будет работать? Александр Павлович один из немногих, кто владеет практически всем спектром кардиохирургических вмешательств. Например, операции при аневризмах дуги аорты в Беларуси выполняют только два человека — Юрий Островский и Александр Шкет. Вы знаете, он ведь незаменим, он очень грамотный хирург, суперспециалист. Он должен спасать людей и учить своих коллег тому, чего достиг сам.

Мы все же надеемся, что приговор суда не будет таким жестоким.

**Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.**

Народная Воля http://www.nv-online.info
1 МАЯ 2008 г.

# Кацярыне Маркоўскай прапанавалі заплаціць за адукацыю 28 мільёнаў рублёў і не ехаць у «раёнку»

У беларускіх ВНУ пачаліся размеркаванні выпускнікоў. Студэнтка 5-га курса факультэта журналістыкі БДУ, прэс-сакратар Партыі БНФ Кацярына Маркоўская сцвярджае, што на іх факультэце размеркаванне прайшло з парушэннямі. Кацярыну ці то па іроніі лёсу, ці то наўмысна размеркавалі ў крычаўскую газету "Ленінскі кліч". Гэтым часам з мясцовай "раёнкай" судзіцца сябра Партыі БНФ Уладзімір Кудраўцаў, ды і ўвогуле "адносіны" газеты з партыяй можна назваць напружанымі. Але парушэнне, вядома ж, не ў гэтым.

— Існуе палажэнне аб размеркаванні, — кажа Кацярына. — Калі выпускніку не прапаноўваюць месца працы ў адпаведнасці з яго спецыяльнасцю, то даюць свабодны дыплом. Я скончыла факультэт па спецыяльнасці "літаратурны рэдактар" і мела запыт па спецыяльнасці з Ліды, з выдавецкага дома ГА "Таварыства беларускай мовы", з якім я, дарэчы, супрацоўнічала. Аднак мяне размеркавалі ў газету "Ленінскі кліч" на журналісцкую працу загадчыкам аддзела сельскай гаспадаркі.

— Тым, хто не пагаджаецца з размеркаваннем, — працягвае Кацярына, — прапанавалі адкупіцца: заплаціць за адукацыю 28 мільёнаў рублёў і выбіраць працу па душы. Увогуле я не здзівілася, што мой запыт на працу не задаволілі і паслалі ў Крычаў. За ўсе гады навучання на факультэце да мяне заўсёды была павышаная ўвага. Нягледзячы на тое, што я добра вучылася, апошнюю сесію, напрыклад, на ўсе дзесяткі здала, праблемы былі заўсёды, у дэканат, як трэцякласніцу, выклікалі з бацькамі, размовы вялі ні аб чым.

Размеркаванне Кацярына Маркоўская не падпісала. 28 красавіка студэнтка падала скаргу ў Міністэрства адукацыі, у якой сцвярджае, што ў адносінах да яе пры размеркаванні было парушана Палажэнне аб размеркаванні. Калі гэта плёну не дасць, дзяўчына мае намер звяртацца ў суд.

## ТЫМ ЧАСАМ

# З Віталя Алейніка дзяржава патрабуе 12 мільёнаў рублёў

На пачатку мая ў судзе Маладзечанскага раёна павінны пачацца слуханні па справе аб кампенсацыі з аспіранта Віталя Алейніка сродкаў за навучанне.

Ісцец па гэтай справе — пракурор Мінскай вобласці ў інтарэсах дзяржавы. Трэцяй асобай з'яўляецца Міністэрства замежных спраў Беларусі.

Справа ў тым, што ў 2002 годзе Віталь Алейнік выйграў конкурс МЗС Беларусі і быў накіраваны на вучобу ў вядомы Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных зносін (па-руску МГИМО). Разам з ім у Маскву па гэтай жа праграме паехалі навучацца яшчэ тры студэнты. Беларускі бок аплачваў хлопцам інтэрнат і даваў стыпендыю.

Калі юнакі скончылі навучанне, ніводны з іх у Беларусь не вярнуўся. Віталь Алейнік паступіў у аспірантуру таго ж інстытута міжнародных зносін, дзе і навучаецца зараз. А славутую маскоўскую вышэйшую навучальную ўстанову беларус скончыў з чырвоным дыпломам.

Сёлета дзяржава вырашыла спагнаць з былых студэнтаў грошы за навучанне. Цана адукацыі кожнага склала 12 мільёнаў беларускіх рублёў. Тры справы разглядаліся ў Ленінскім судзе Мінска, чацвёртая павінна слухацца ў гэтыя дні ў судзе Маладзечанскага раёна — адтуль родам Віталь Алейнік.

— Раней такой практыкі, як спагнанне сродкаў са студэнтаў Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных зносін, якія адмовіліся прыехаць на працу ў беларускае Міністэрства замежных спраў, не існавала, — кажа Віталь Алейнік. — Што змянілася зараз? Артыкул Канстытуцыі аб бясплатнай адукацыі, здаецца, ніхто не адмяняў. Не маючы ніякіх абавязацельстваў перад дзяржавай у цэлым і беларускім МЗС у прыватнасці, я планаваў вярнуцца пасля атрымання адукацыі ў Мінск, на працу ў міністэрства. А зараз, мяркую, наўрад ці так будзе. Пасля вядомых сакавіцкіх падзей 2006 года і рэферэндуму 2004-га ў нашай дзяржаве адбыліся кардынальныя змены...

Дарэчы, суд Ленінскага раёна Мінска прыняў рашэнне спагнаць у бюджэт краіны со студэнтаў маскоўскага інстытута 12 мільёнаў рублёў. Зразумела, з кожнага.

**Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.**

## СУСЕДЗІ

# «Еўропа не будзе шчаслівай без Украіны і Беларусі»

**У час сустрэчы былога прэзідэнта Польшчы Леха Валенсы з удзельнікамі канферэнцыі арганізацыі "Еўрапейскія дэмакратычныя студэнты", што праходзіла ў Гданьску, была закранута беларуская тэматыка.**

У адказе на пытанне аб палітычных перспектывах Беларусі былы польскі прэзідэнт сказаў, што падчас свайго кіравання ён выступаў катэгарычна супраць уваходжання Польшчы ў Еўрасаюз без Беларусі і Украіны. Аднак яго наступнік Аляксандр Квасьнеўскі прытрымліваўся іншай думкі.

Лех Валенса зазначыў, што цяпер Еўропа аказвае Беларусі дапамогу не на поўную моц, паколькі Еўропа яшчэ не да канца аб'ядналая і моцная. Былы прэзідэнт выказаў надзею, што неўзабаве такое становішча зменіцца, і дзякуючы гэтаму дэмакратычная Беларусь увойдзе ў склад краін з еўрапейскімі каштоўнасцямі і еўрапейскім узроўнем жыцця. "Еўропа не будзе шчаслівай без Беларусі і Украіны", — заявіў Лех Валенса.

**Сцяпан СВІДЗЕРСКІ.**

## СКАЗАНО!

# Александр ЛУКАШЕНКО:

**"Месяц назад я вызвал главу Администрации президента и сказал, что буду пристальнейшим образом рассматривать членство своих подчиненных — членов правительства, губернаторов в этой организации ("Белой Руси". — *Ред.*")... Я у него (чиновника) спрошу, почему он туда пошел, что ему там делать. Ему что, работы не хватает? У нас хватает работы, и не надо ходить по партиям и организациям".**

***

Александр Григорьевич, немедленно вызывайте на ковер министра образования г-на Радькова. Спросите, почему он туда, в "Белую Русь", пошел, что ему там делать? Ему что, действительно, работы не хватает? Его что, не волнует то, что в школах, колледжах, институтах, университетах проблем выше головы? Разобраться бы министру в них, а он, видите ли, созданием какого-то общественного объединения занялся. Не хочет быть министром? Тогда, Александр Григорьевич, помогите ему освободиться от этой должности.

# Казулін сустрэнецца з дочкамі

Адміністрацыя калоніі "Віцьба-3" дазволіла экс-кандыдату ў прэзідэнты, лідэру Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Аляксандру Казуліну трохдзённае спатканне з дочкамі, якое пачнецца 3 мая. Пра гэта БелаПАН паведаміла старэйшая дачка палітыка Вольга Казуліна.

Паводле яе слоў, пра тое, што спатканне дазволена, А.Казулін напісаў у лісце.

# А ім усё мала

*"На друкаваныя СМІ мы выдаткуем з рэспубліканскага бюджэту прыблізна 5 млрд рублёў"*, — паведаміў міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір Русакевіч падчас анлайн-канферэнцыі на сайце Беларускага тэлеграфнага агенцтва.

*"Як міністр інфармацыі лічу, што дзяржава яшчэ недастаткова сродкаў выдзяляе на развіццё СМІ"*, — сказаў ён.

## ЧУЛІ?

# Беларусь зноў просіць грошы ў Расіі

Віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Андрэй Кабякоў абверг паведамленні некаторых расійскіх СМІ, нібыта расійскі бок адмовіўся даць Беларусі чарговы крэдыт памерам 2 мільярды долараў.

"Ніякай адмовы не было, перамовы вядуцца, можа быць, не так актыўна, як нам хацелася б. Але яны працягваюцца", — сказаў Кабякоў. На пытанне, калі можна чакаць вынікаў гэтых перамоў, віцэ-прэм'ер адказаў: "Спадзяюся, сёлета, бо найвышэйшыя службовыя асобы расійскай дзяржавы абяцалі гэты крэдыт".

Нагадаем, напрыканцы 2007 года, пасля візіту ў Мінск Уладзіміра Пуціна, Беларусь ужо атрымала крэдыт памерам паўтара мільярда долараў.

# Спадзяёмся

У праекце бюджэту Беларусі на 2009 год закладзены кошт 140 долараў за 1000 кубаметраў газу.

Нагадаем, што расійскі бок афіцыйна пакуль не даваў ніякіх падобных абяцанняў. Наадварот, як паведаміў нядаўна намеснік дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Васіль Хрол, згодна з разлікамі, газ у наступным годзе можа каштаваць для Беларусі больш за 200 долараў. Выходзіць, ва ўрадзе працуюць аптымісты...

# З газу — на вугаль

Расія і Кітай могуць стаць інвестарамі будаўніцтва вугальных станцый у Беларусі. Пра гэта паведаміў намеснік міністра энергетыкі Міхаіл Міхадзюк на прэс-канферэнцыі ў Мінску.

"Адносна вугальных станцый ёсць прапановы з боку Кітая, Расіі, іншых дзяржаў", — сказаў намеснік міністра.

Паводле яго слоў, у Беларусі прапрацоўваюцца праекты па будаўніцтве дзвюх вугальных станцый: у горадзе Зэльва (магутнасць станцыі складзе каля 600 МВт) і ў Брэсце (100 МВт).

Да нядаўняга часу амаль усе беларускія электрастанцыі працавалі на газе.

# Улады спрабуюць ліквідаваць дэфіцыт медыкаў

У Беларусі ў 2008 годзе плануецца павялічыць мэтавы набор у медыцынскія ВНУ. Пра гэта заявіў старшыня Пастаяннай камісіі па праблемах чарнобыльскай катастрофы, экалогіі і прыродакарыстанні Віталь Кулік. Паводле яго слоў, мэтавы набор будзе складаць 20 працэнтаў ад агульнай колькасці студэнтаў, якія навучаюцца за кошт бюджэтных сродкаў (у 2006—2007 гадах было 10 працэнтаў).

Віталь Кулік растлумачыў, што такая мера неабходна для вырашэння праблемы забеспячэння медыцынскімі кадрамі рэгіёнаў, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. "Да гэтага часу Міністэрству аховы здароўя не ўдалося выканаць рэкамендацыі па прыярытэтным камплектаванні ўрачамі медыцынскіх устаноў у рэгіёнах, пацярпелых ад радыеактыўнага забруджвання", — канстатаваў кіраўнік камісіі. Паводле яго даных, укамплектаванасць урачамі ў гэтых рэгіёнах складае 92 працэнты пры каэфіцыенце сумяшчальніцтва 1,5.

## СЛЕДСТВА

# «Справе нададзены грыф дзяржаўнай тайны»

Стан амерыканскага юрыста Эмануіла Зельцэра, які знаходзіцца пад арыштам у Мінску, цяжкі, асобныя медыкаменты ён не атрымлівае. Пра гэта паведаміў БелаПАН адвакат абвінавачанага Дзмітрый Гарачка. Паводле яго слоў, следства працягваецца, а справе "нададзены грыф дзяржаўнай тайны". *"Таму я вам усё расказваць не магу. На жаль, фактычна — толькі пра стан здароўя"*, — заявіў Д.Гарачка.

Нагадаем, што Эмануіл Зельцэр разам з сакратаром, грамадзянкай Расіі Уладленай Функ быў арыштаваны КДБ Беларусі 12 сакавіка пасля прылёту ў Мінск. Іх абвінавацілі ў выкарыстанні загадзя падробных дакументаў.

Д.Гарачка з'яўляецца таксама адвакатам экс-кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна. Другім яго вядомым кліентам быў экс-кіраўнік "Белнафтахіма" Аляксандр Бароўскі. Д.Гарачка прызначаны дзяржавай абараняць у судзе інтарэсы не толькі Э.Зельцэра, але і У.Функ.

Кіраўнік НДА "Асацыяцыя адвакатаў горада Нью-Йорка" Бэры Кэмінз ад імя арганізацыі 23 красавіка звярнуўся да беларускага прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі і заклікаў "зрабіць усе неабходныя крокі, каб неадкладна вызваліць Зельцэра і Функ".

Б.Кэмінз выказаў занепакоенасць "затрыманнем і неналежным абыходжаннем" з амерыканскім адвакатам. У звароце кіраўнік асацыяцыі сцвярджае, што Э.Зельцэр *"рэгулярна збіваецца, у прыватнасці, яго б'юць па галаве"*. Бэры Кэмінз звяртае ўвагу на тое, што, нягледзячы на наяўнаць у яго калегі дыябету, артрыту, хворага сэрца і язвы, яму *"адмоўлена ў жыццёва неабходных леках"*.

На думку Б.Кэмінза, абвінавачанне наўрад ці можа быць юрыдычна абгрунтаваным, бо *"Зельцэр і Функ не мелі пры сабе дакументаў і, апрача таго, былі затрыманы непасрэдна пасля прыбыцця"*. Кіраўнік асацыяцыі нью-йоркскіх адвакатаў лічыць, што дзеянні беларускіх улад супярэчаць міжнародным абавязацельствам рэспублікі, у прыватнасці, Міжнароднай канвенцыі ААН аб грамадзянскіх і палітычных правах і Канвенцыі супраць катаванняў і іншых відаў абыходжання або пакарання.

Асацыяцыя адвакатаў горада Нью-Йорка заклікала беларускія ўлады неадкладна забяспечыць Э.Зельцэру доступ да неабходных лекаў, таму што яго стан здароўя можа быць крытычным.

Копіі звароту адпраўлены ў пасольства і генеральнае консульства Беларусі ў ЗША, у Генеральную пракуратуру Беларусі, а таксама ў Дзярждэпартамент — намесніку дзяржсакратара ЗША па дэмакратыі і глабальных пытаннях Поле Дабранскі і яе намесніку па краінах Еўразіі Дэніелу Фрыду.

**Марына РАХЛЕЙ.**

## ЗНАЁМЦЕСЯ!

# Аляксандра Патупу змяніў Аляксандр Калінін

**Ва ўрада Беларусі няма іншага выйсця, акрамя як ісці па шляху ліберальных рэформ. Такое меркаванне выказаў старшыня Беларускага саюза прадпрымальнікаў (БСП) Аляксандр Калінін, абраны на гэтую пасаду на X з'ездзе аб'яднання.**

*"Задача новага кіраўніцтва саюза — усяляк садзейнічаць прасоўванню рэформ у краіне"*, — сказаў ён. У найбліжэйшыя тры гады (на такі тэрмін абіраецца кіраўнік саюза. — Рэд. ) БСП будзе працягваць дамагацца спрашчэння падатковай сістэмы, зніжэння штрафных санкцый, скарачэння адміністрацыйных працэдур для бізнесу, а таксама забеспячэння рэальнай роўнасці ўсіх форм уласнасці, што прадугледжана артыкулам 13 Канстытуцыі, заявіў А.Калінін.

Беларуская мадэль "рыначнага сацыялізму", на думку А.Калініна, пачынае "правальвацца" па такім паказчыку, як сярэдняя заработная плата насельніцтва. *"Сёння мы ўсё больш адстаём ад Расіі, не гаворачы пра краіны Балтыі і Польшчу. Нас амаль дагнала Украіна, і ёсць усе падставы лічыць, што яна перагоніць нас па гэтым паказчыку да канца 2008 года"*, — заявіў кіраўнік БСП. Сітуацыя, паводле слоў А.Калініна, можа яшчэ больш пагоршыцца пасля далучэння Расіі да СГА. У сувязі з гэтым можна гаварыць аб масавай працоўнай міграцыі беларусаў у Расію. Згодна з ацэнкамі саюза, з'ехаць на заробкі ў суседнюю краіну могуць прыблізна 1,5 млн чалавек.

Нагадаем, ранейшы кіраўнік БСП Аляксандр Патупа ў лістападзе 2007 года падаў у адстаўку. Сваё рашэнне пакінуць кіруючую пасаду, якую ён займаў з 2001 года, А.Патупа патлумачыў жаданнем засяродзіцца на літаратурна-аналітычнай працы і даць магчымасць праявіць сябе на гэтай пасадзе маладым.

А.Калініну 49 гадоў, ён кандыдат эканамічных навук.

А.Патупа абраны ганаровым старшынёй БСП.

**Дзмітрый ЯРМАК.**

## НЕЗЛОБИВЫЕ ЗАМЕТКИ

Семен БУКЧИН

# О «потайных мыслях» и сигналах от газеты «Завтра»

### 1.

Рухнула башня Пищаловского замка.

"Дурное предзнаменование для власти, — сказал мой знакомый. — Разрушаются тюрьмы".

И я тоже готов был поверить в эту примету.

Конечно, ничто не вечно...

Но с другой стороны, это же сколько лет простояло?

Да, крепко строили в старые времена.

Что же до власти, то здесь проблема только в одном: что будет выстроено взамен?

В условиях дефицитного бюджета тратиться на современную, соответствующую европейским стандартам тюрьму власть, естественно, не будет.

Но и приспосабливать под узилище, как это ранее практиковалось, монастыри и другие старинные сооружения, как-то нынче не с руки. Да и монастырями сейчас церковь занимается.

В общем, вопрос о новой тюрьме — это не только бюджетная проблема.

Это, так сказать, некий взгляд в наше недалекое будущее.

Какова тюрьма, таково в известной степени и это самое будущее.

Поэтому предлагаю проект будущего тюремного сооружения вынести на широкое общественное обсуждение.

Уверен: отказавшись от участия в обсуждении как наскучивших проектов различных партий, касающихся коренного реформирования и соответственно улучшения нашей жизни, так и государственных подачек (в виде возврата льготного пенсионного проезда на несчастные сотки), наш народ примет живейшее участие в "тюремном вопросе".

Поскольку тюрьма для нас — это не какая-то абстракция вроде демократии и свободы. А напротив — дело житейское, привычное, а потому очень даже понятное.

И от него наш народ никогда не зарекался...

### 2.

В интервью, которое дал "Народной воле" новый главный "идеологический" начальник Янчевский, меня особо заинтересовало вот это место: *"Но если у госслужащего есть какие-то потайные или двойные мысли, то он должен просто уйти"*.

Вот как надо свидетельствовать свою суперпреданность системе! Учитесь у молодого, старые кадры!

Имеешь потайные мысли — уходи!

Но кто ж в таком грехе добровольно признается?

Вроде и соблазнительно заглянуть под черепную коробку белорусского госслужащего. Действительно, что у него там за мысли? И есть ли в самом деле "потайные и двойные"?

Правда, и сильное сомнение берет: скорее всего там вообще никаких мыслей нет.

Пусто. Как во вскрытой консервной банке.

А вдруг все-таки есть?

Как узнать?

Пока от Национальной академии наук в этом нужнейшем деле власть не имеет никакой помощи. А нужда великая.

Со своей стороны, могу кое-что порекомендовать из опыта дореволюционной России. Когда будущий председатель Государственной Думы Родзянко только начинал свою карьеру и его выбрали председателем Екатеринославской губернской земской управы, он в первом же своем распоряжении объявил, что примет меры для того, чтобы *"все гг. служащие по всем вопросам держались самого желательного и надлежащего образа мыслей"*.

Вы спросите: ну и как ему это дело удалось?

История не сохранила на сей счет свидетельств. Хотя говорят, что по сути ничего нового придумано не было: просто чиновникам объявили, что с такого-то дня об их образе мыслей будет докладываться самому председателю управы. Говорят также, что особо отличился среди служащих некий Иван Петрович, который в специальном заявлении на имя Родзянко написал, что у него не только нет "ненадлежащих", "но и вообще никаких мыслей не замечается". Иван Петрович был поставлен в пример и даже сильно пошел на повышение.

Так что были и у наших деятелей вполне достойные предшественники.

Но все-таки нельзя равнять дореволюционных чинуш с нынешними молодыми, умелыми, рассуждающими. Как говорят в чиновной среде — грамотными.

Вот спрашивают г.Янчевского, стало ли для него неожиданным решение президента назначить его главным идеологическим начальником. И г.Янчевский уверенно отвечает: *"Любое решение главы государства трудно спрогнозировать..."* Кому-то покажется, что это сомнительный комплимент в адрес главы государства, рисующий этого самого главу как личность непредсказуемую и так далее...

Но мы твердо скажем этому сомневающемуся: не нужно "перекручивать"! Г-н Янчевский имел в виду высокую мудрость главы государства. Правда, получилось двусмысленно... Но ведь он хотел как лучше! Это нужно прежде всего принимать во внимание!

Надо сказать, что, несмотря на молодость, г.Янчевский достаточно зрело судит о многих вещах. Казалось бы, молодым свойственны нетерпение, жажда перемен, стремление к новому. А г.Янчевский не спешит, ему немногим за тридцать, а рассуждает он, как семидесятилетний почтенный бюрократ: *"кардинальные изменения должны происходить тогда, когда сложилась критическая ситуация"*, *"надо приспосабливаться к дню сегодняшнему"*.

Вот с этим очень важным словом — *"приспосабливаться"* — вообще не поспоришь. Хочешь жить — нужно приспосабливаться. Тем более, если хочешь жить не просто хорошо, а очень хорошо. Это правильная философия.

Кое-кто может заметить, что в интервью г.Янчевского ничего не сказано по поводу конкретного содержания той самой идеологической работы, на которую его поставили. Что это за работа, в чем она заключается?

Но ведь давно известно: идеологическая работа — настолько тонкая материя, что ее просто так не ухватишь, не пощупаешь пальцами. Либералы твердят, что идеология — непременный признак тоталитарного государства. А как, в самом деле, без нее быть? Как прикажете бороться с теми же "потайными или двойными мыслями"? Тут она, идеология, оказывается самым верным оружием.

И как не согласиться с г.Янчевским, что нельзя о "стране, где есть масса очевидных положительных вещей", писать только плохое. Но можно ли считать *очевидной положительной вещью то*, что "Народная воля", не какая-нибудь подпольная, а зарегистрированная в государственном органе газета, лишена возможности печататься в Минске, как и права продаваться в киосках, поступать к читателям по подписке? У нас ведь не времена Герцена и Ленина, когда "Колокол" и "Искру" доставляли в Россию в чемоданах с двойным дном. Почему же легальная газета "Народная воля" должна печататься за границей, в Смоленске, а доставляют ее в Минске подписчикам не почтальоны, а разносчики-добровольцы?

Замечательно, что г.Янчевский вслед за своим патроном призывает писать правду. Но если газета пишет неправду, то для соответствующей разборки существует суд. Зачем это постыдное выкручиванье рук, этот беспричинный и, безусловно, продиктованный сверху сговор-отказ типографий и "Белпочты"? Неужто это и есть тот самый закон, по которому, по словам г.Янчевского, накажут того, кто "будет писать очередную клевету"?

*"Никто не скажет, что в "Советской Белоруссии" никого не критикуют"*, — не без пафоса заявляет г.Янчевский. Но ведь и в "Народной воле" тоже критикуют... Так в чем же дело? В том, как критикуют? Или в том, как воспринимают критику? А что если восприятие последней связано с уровнем развития личности? А уровень этот, скажем мягко, невысокий? Что же делать? Ложиться под эту самую личность и подыхать? Или все-таки отстаивать свои взгляды? А может быть, лучше всего скрывать их, т.е. иметь те самые "потайные мысли"? Похоже, это нынче удел большинства граждан Беларуси.

Но двоемыслие опасно. Оно истощает нервную систему. А ежели еще в экономике плохо... Тогда режимы валятся, как та самая башня Пищаловского замка. Все внешне вроде выглядит хорошо, крепко, имеется, как говорит г.Янчевский, "политическая стабильность". А внутри, оказывается, все сгнило, струхлело. Вот и повалилось...

### 3.

Кстати, о "Советской Белоруссии"... Смотрящий по Беларуси от суперпатриотической российской газеты "Завтра" г.Ростиков узрел страшную крамолу на страницах президентского издания. Оказывается, "СБ" напечатала "реабилитационную" статью о Ларисе Гениюш, этой, цитирует с сарказмом Ростиков, "вядомай нацыянальнай паэтке", а на самом деле пособнице фашистских оккупантов. На подходе и реабилитация другой "фашистской прислужницы", Натальи Арсеньевой. И потому г.Ростиков, как ответственный человек, не может не доложить своему московскому начальнику и главному российскому борцу за незамутненную славянскую чистоту А.Проханову о происках почитателей "паэтак" с подпорченной биографией на земле такой, на первый взгляд, тихой и преданной российской сестры, какой всегда была в глазах Москвы Беларусь. Здесь не место для разговора о неоднозначности переплетений судьбы конкретного человека и его художественного дара. Гитлер ценил Вагнера, а Гамсун поддерживал Гитлера. Имена немецкого композитора и норвежского писателя и по сей день в первых рядах мировой культуры. Почему белорусы должны быть лишены замечательного поэтического наследия двух женщин, чьи судьбы сложились достаточно трагично? О чем, кстати, можно написать вполне объективно, не скрывая и самых сложных страниц их жизни.

Впрочем, все эти "литературные проблемы" мало заботят г.Ростикова. Он ищет "корень зла" и находит его. Дело, оказывается, в том, что редактор президентской газеты "конечно же, еврей". Безусловно, по-своему замечательно это утверждение — "конечно же". Почему редактор президентской газеты должен быть обязательно евреем, г.Ростиков не объясняет. Поэтому остается предположить, что в этом утверждении "конечно же" содержится определенное объяснение причины появления "положительной" публикации о Ларисе Гениюш в "СБ". В общем, кому как не редактору-еврею и печатать статьи о "профашистских" "паэтках"? Звучит, конечно, странно. Уж еврею-то полагалось бы бежать от этой темы да пошустрее. Но тут, видимо, г.Ростиков узрел некий сионистско-фашистский заговор с белорусским националистическим оттенком. Вещь, разумеется, сложная, не всякому понятная. Но г.Ростиков тем не менее ударил в набат. И, видимо, ждет, что его тревожный звон будет услышан.

А может, и впрямь у белорусского корреспондента московской газеты "Завтра" есть шанс быть услышанным? Знает, кому посылает сигнал... Пикантность ситуации, однако, состоит в том, что именно г.Ростиков, относящийся к евреям, как говорил один старый публицист, "достодолжно", озабочен ныне тем, что "президентская газета... подает этих антисемитов уже под современным" национал-патриотическим соусом.

Вот ведь какие курбеты выбрасывает жизнь! Есть от чего сойти с ума. Ростиков борется с антисемитами, которых пропагандирует сама президентская газета! Как говорил один из героев Щедрина, "так извертишься порой, что сам себя не узнаешь".

Народная Воля http://www.nv-online.info
1 МАЯ 2008 г.

## І гэта толькі пачатак

**Суд Савецкага раёна Мінска абавязаў заяўнікаў "Еўрапейскага маршу" выплаціць 2,1 млн рублёў на карысць УП "Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама".**

Вулічная акцыя апазіцыі "Еўрапейскі марш" адбылася ў Мінску 14 кастрычніка 2007 года.

25 лютага 2008 года суд правёў першае пасяджэнне па іску УП "Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама". Прадпрыемства запатрабавала ад заяўнікаў "Еўрапейскага маршу" кампенсаваць затраты на ўборку вуліц сталіцы пасля акцыі ў памеры 2 млн 135 тыс. 974 рублёў.

Нарэшце ў канцы красавіка суд сваім рашэннем поўнасцю задаволіў патрабаванні істца і пастанавіў спагнаць патрабуемую суму салідарна з заяўнікаў — лідэра руху "За Свабоду" Аляксандра Мілінкевіча, намеснікаў старшыні Партыі БНФ Віктара Івашкевіча і Вінцука Вячоркі, лідэра Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі і маладзёжных лідэраў Дзмітрыя Федарука і Яўгена Афнагеля.

*"Падчас судовага разгляду не прагучала ніводнага доказу таго, што "Гаррамаўтадар" панёс дадатковыя расходы па ўборцы і вывазе смецця"*, — заявіў БелаПАН А.Лябедзька.

Паводле яго слоў, рашэнне суда "стварае небяспечны прэцэдэнт". *"Улада радыкалізуе частку грамадства. Цяпер проста губляецца сэнс спрабаваць у прававым полі рэалізаваць канстытуцыйныя правы грамадзян на правядзенне масавых мерапрыемстваў. Людзі перастануць звяртацца да ўладаў па дазвол на правядзенне вулічных акцый, ніхто не будзе браць адказнасць за іх правядзенне. Як вынік, акцыі будуць больш радыкальнымі"*, — лічыць палітык.

А.Лябедзька паведаміў, што такія іскі заяўнікам вулічных акцый прад'явілі яшчэ сем арганізацый Мінска.

**Сяргей КАРАЛЕВІЧ.**

## Статкевіч адклікаў сваіх

**Еўрапейская кааліцыя адклікае сваіх прадстаўнікоў з кіруючых органаў аб'яднаных дэмакратычных сіл (АДС). Пра гэта паведаміў старшыня аргкамітэта па стварэнні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) Мікалай Статкевіч.**

Палітык заявіў, што такое рашэнне было прынята з-за шэрагу прычын. Па-першае, Еўрапейская кааліцыя лічыць, што ў кіруючых органах АДС "склалася ўстойлівая нееўрапейская большасць". Па-другое, з лета мінулага года кіраўніцтва АДС, паводле слоў М.Статкевіча, "ігнаруе прапановы аб еўрапейскай выбарчай платформе дэмакратычнай апазіцыі на парламенцкіх выбарах". Па-трэцяе, "ва ўмовах вырашальнага геапалітычнага выбару паміж інтэграцыяй у ЕС і інкарпарацыяй у склад Расіі кіраўніцтва дэмакратычнай апазіцыяй сіламі, якія ігнаруюць сігналы еўрапейскіх лідэраў аб магчымасці еўраінтэграцыі нашай краіны, стварае дадатковую пагрозу незалежнасці Беларусі".

**Сяргей КАРАЛЕВІЧ.**

### СЛЫШАЛИ?

## Происшествие не забыли...

Из "Белгоспищепрома" уволена один из наиболее влиятельных чиновников отрасли, заместитель председателя концерна Лариса Плиско. Отвечая за экономическое состояние всех предприятий концерна, Плиско являлась фактически ключевой фигурой. Однако при увольнении попала под нетипичную для чиновников формулировку — "в связи с истечением срока контракта".

Как говорят в концерне, причиной увольнения наверняка стала история годичной давности, когда прокуратура возбудила в отношении Плиско уголовное дело. Тогда сообщалось, что Лариса Плиско, злоупотребляя доверием работников концерна "Белгоспищепром", предоставила им заведомо ложные сведения о своей трудовой деятельности, которые были необходимы для получения надбавки к заработной плате за продолжительность непрерывного трудового стажа. Во время скандала Плиско срочно ушла на больничный, и историю тихо замяли. Но, по мнению работников концерна, в нужных инстанциях происшедшее не забыли, а потому контракт с Ларисой Николаевной продлен не был.

Кстати, на должность первого заместителя председателя концерна назначен Генрих Черняк, ранее возглавлявший управление в этой же структуре. Сейчас вся экономика пищевой промышленности будет сосредоточена в его руках.

**Елена НОВИКОВА.**

### ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

## Сцягі СССР былі ў руках сяброў Камуністычнай партыі Беларусі

У "Народнай волі" за 24 красавіка б.г. змешчана карэспандэнцыя "Покажите мне такую страну, где славят тирана...". Аўтар памылкова дапусціў недакладнасць у назве партыі праўладных камуністаў. Падчас ускладання кветак да помніка У.Леніна сцягі СССР і чырвона-зялёныя дзяржаўныя сцягі Рэспублікі Беларусь былі ў руках сяброў **Камуністычнай партыі Беларусі**, а не Партыі камуністаў Беларусі, як выпадкова напісана ў вышэйзгаданай публікацыі.

### БЕСПРЕДЕЛ

# Сотрудник МВД изнасиловал студентку

*Эта история случилась 8 Марта в центре Минска. Студентка младших курсов одного из белорусских вузов возвращалась домой из пиццерии. Ее остановил сотрудник милиции в форме и попросил пройти вместе с ним в служебную машину. В милицейском авто девушку изнасиловали...*

— Когда мы с подружками вышли из пиццерии, было, наверное, около половины одиннадцатого вечера, — *рассказывает Ольга "Народной воле" (имя героини этой дикой истории по понятным причинам изменено).* — Подружки поехали домой на метро, а я пошла пешком. На одной из центральных улиц Минска меня остановил милиционер в форме и попросил проследовать за ним. Естественно, никаких дурных мыслей у меня не возникло, и я без сомнений пошла за ним. Он предложил сесть в машину и сам сел рядом. В машине на передних сиденьях сидели еще двое в форме. Потом они вышли, а он меня изнасиловал. Естественно, я сопротивлялась, как могла. Можно чисто теоретически рассуждать, как надо вести себя в подобных ситуациях, но в реальности все происходит по-другому...

Когда те двое милиционеров вернулись, мне открыли дверь машины, и все уехали...

Я кое-как дошла домой. Вначале рыдала навзрыд. Потом позвонила подруге, все рассказала. Затем мы вызвали "скорую" и милицию.

Милиционера я опознала. В тот день он с коллегами патрулировал район...

Меня настойчиво просили забрать заявление из милиции, чтобы не раздувать скандал. Тот, кто меня насиловал, просил его пожалеть и понять, говорил, что у него маленький ребенок и беременная жена... Ему самому около 30 лет.

Двое его коллег выступают в его защиту как свидетели. Они говорят, что никакого изнасилования не было. Хотя если они при исполнении, то не имеют права садить в машину посторонних лиц.

А насильник говорит, что признает свой проступок, но будто бы все произошло по моему согласию. Хотя это ложь!

### ЗВОНОК СЛЕДОВАТЕЛЮ

*"Мы не намерены разглашать это дело"*, — сказал следователь прокуратуры, который ведет это дело, сославшись на тайну следствия.

### ЗВОНОК В МВД

Одно из главных правил журналистики — дать высказаться всем сторонам. Поэтому "Народная воля" позвонила в МВД с просьбой сообщить координаты "главного героя". Там ответили: он у нас больше не работает.

*"По окончании служебной проверки он был уволен за дискредитацию звания сотрудника органов внутренних дел"*, — сказали "Народной воле".

### СЛОВАРЬ

*Изнасилование — преступное деяние, заключающееся в половом сношении, совершенном с применением физического насилия, угроз или с использованием беспомощного состояния потерпевшей.*

*Считается одним из наиболее тяжких и распространенных посягательств на половую свободу взрослых женщин и половую неприкосновенность несовершеннолетних.*

*Изнасилование с точки зрения медицины и психиатрии — это кризисное событие с далеко идущими последствиями. Оно наносит женщине серьезную не только физическую, но и психологическую травму и нередко способствует формированию у нее негативного отношения к половой близости, что впоследствии может сказаться на ее семейном счастье.*

### ВЗГЛЯД СО СТОРОНЫ

# «Подобные случаи, как правило, влекут отставку главы МВД»

**За последнее время случилось немало громких эпизодов, главные герои которых — люди в милицейских погонах.**

**Приговоренный к высшей мере наказания маньяк в погонах Александр Сергейчик (тоже, кстати, сотрудник МВД).**

**"Живой щит", созданный белорусскими гаишниками.**

**Жесточайшие избиения мирных демонстрантов.**

**Свидетельские показания омоновцев в судах над представителями оппозиции...**

**Такое впечатление, что министр внутренних дел уже просто не в состоянии контролировать своих подопечных...**

## Гарри ПОГОНЯЙЛО, юрист, бывший судья:

В литературе про изнасилования пишут, что в обществе широко распространены представления о том, что если женщина идет с мужчиной в кафе и позволяет ему расплатиться, то он может ошибочно принять это как молчаливое разрешение на интимную близость. Уверена: с этим мнением готовы поспорить многие женщины. Однако в данном случае девушка пошла вместе не с каким-то вонючим бомжом, не с выпившим мужчиной сомнительного вида, который клеился к ней на улице, *а с представителем органов правопорядка, с человеком в форме!*

Если бы меня попросил сотрудник милиции пройти вместе с ним — я бы тоже, наверное, пошла. И никаких задних мыслей, как и у этой девушки, при этом не возникло бы. А после этой истории — возникнут. Даже если вечером гаишник на дороге остановит.

Насильник в погонах утверждает, что "интимный акт" состоялся по обоюдному согласию. А девушка утверждает, что она была категорически против. Лично я верю ей. Если женщина сказала "нет", пусть даже шепотом, пусть даже уже в постели, значит, мужчина должен остановиться. Только очень неумный мужчина может не понять, что дама не желает вступать в интимную связь, если она просит оставить ее в покое.

Хочу понять: до какой степени нужно быть уверенным в своей безнаказанности, чтобы в центре Минска, в служебном авто насиловать приглянувшуюся прохожую девушку?..

— Конечно же, случай беспрецедентный! Но не могу ручаться за то, что подобное не повторится с другими "правоохранителями".

Я давно публично заявляю, что в Беларуси выстроено полицейское государство. И, пожалуй, сама власть не заметила, как органы охраны правопорядка — порядка, установленного Конституцией и законами, принятыми на ее основе, — из правоохранительных превратились в "правохоронительные". В народе их так и называют с легкой руки известного правозащитника и журналиста Валерия Щукина. Преступность в стране, как отмечалось в печати, растет, а милиция (как, впрочем, и КГБ) занимается политическим сыском, превентивными задержаниями и арестами гражданских активистов, неадекватным применением силы против мирных демонстрантов, репрессивным использованием административной и уголовной юстиции в политических целях.

Нередко мы становимся свидетелями фабрикации уголовных дел с целью отнять бизнес, наказать "правдоискателя" ("жалобщика"); в условиях кампанейщины показать видимость борьбы с преступностью, повысить процент раскрываемости. К примеру, по делам о коррупции, торговле людьми, проституциии и т.п.

Но там, где власть насаждает такого рода деятельность, исполнители ожидают от нее не только поощрения, но и защиты от преследования за превышение полномочий, злоупотребления должностным положением. Отсюда и беспредел, вынесенный в рубрику публикации. В том числе и судебный беспредел. Суды Беларуси перестали быть независимым, объективным и эффективным инструментом в борьбе с чиновничьим беспределом. Они позволили исполнительной власти вмонтировать себя в репрессивный механизм подавления прав и свобод человека, за что подвергаются критике как внутри страны, так и в международном сообществе.

Известно, что вседозволенность и подобные "поощрения" развращают кадры, создают питательную среду для нарушений требований закона и уставов.

Подобные случаи серьезных преступлений со стороны сотрудников милиции в демократическом правовом государстве, как правило, влекут отставку министра МВД. Но министр Владимир Наумов может спать спокойно, тем более что он со своей совестью в ладах, а что такое политическая ответственность — он может и не знать: так воспитан.

**Марина КОКТЫШ.**

**P.S.** *"Народная воля" намерена следить за развитием этого дела в суде.*

### НОВЫЯ ІМЁНЫ

## Ілля БОГДАН:

# «Калі б я стаў прэзідэнтам, спачатку прызначыў бы выбары ў парламент, а потым абмежаваў бы свае паўнамоцтвы»

**З намеснікам старшыні незарэгістраванай арганізацыі "Моладзь БНФ" Іллёй Богданам мы знаёмыя даўно. Але пагаварыць пра жыццё і пра палітыку ўсё неяк не атрымлівалася. Нагодай стала ягонае нядаўняе затрыманне...**

**— Ілля, раскажы, як ты стаў бэнээфаўцам?**

— Усё пачыналася з культуры: з музыкі, літаратуры. Я заўсёды цікавіўся палітычным жыццём, чытаў газеты. Таму прыход у апазіцыю для мяне быў даволі асэнсаваным. Можна сказаць, што я прыйшоў туды з пэўным вопытам, бо дагэтуль сябраваў з незарэгістраванай маладзёжнай арганізацыяй "Зубр", якая зараз ужо не існуе. У Партыю БНФ пайшоў яшчэ і таму, што не бачу іншых партый, праграму якіх настолькі падзяляў бы.

**— А як бацькі ставяцца да тваёй дзейнасці?**

— Зараз ужо станоўча, падтрымліваюць. Раней усё было горш — наогул мяне не разумелі. Мае бацькі цалкам не звязаны з палітыкай. Магчыма, мой уплыў іх крыху ўцягвае. Бо я бачу, як яны самі пачынаюць лазіць па сайтах, цікавяцца нейкай інфармацыяй. Але ўсё ж назваць іх "палітычнымі" нельга.

**— А што датычыцца сяброў — ты каго-небудзь прывёў у апазіцыю?**

— Прывёў, але няшмат. Мне не 15 і не 16 гадоў, калі я на духу рамантызму ці юнацкага максімалізму мог прывесці з сабой чалавек сорак. Не факт, што праз месяц яны застануцца. Зараз больш кантактую з людзьмі, якія вызначыліся са сваёй грамадскай пазіцыяй і ведаюць, што ім няма чаго губляць.

**— "Малады фронт" і "Моладзь БНФ" — гэта розныя арганізацыі?**

— Так. Раней "Малады фронт" быў маладзёжнай часткай Партыі БНФ. Потым аддзяліліся з-за непрыязні да пэўных людзей.

**— Кажуць, вы не вельмі любіце адзін аднаго...**

— Такое ёсць. Здараецца шмат сварак, якія адбываюцца з-за нейкіх чутак. Але калі мы займаемся канкрэтнымі справамі, напрыклад, падрыхтоўкай парламенцкіх выбараў ці нават самых простых акцый, я не бачу ніякіх канфліктаў. Зараз час медыя, кожная арганізацыя хоча быць найбольш пазіцыянаванай на інфармацыйным полі, чым астатнія. І таму слова "піяр" прыйшло да нас даволі даўно і добра тут асела. Зараз кожны па-свойму і па-рознаму, часам вельмі крэатыўна, спрабуе падаць сябе.

"Моладзь БНФ" — арганізацыя больш культурная, адраджэнская. Мы часцей разглядаем пытанні мовы і гісторыі. А "Малады фронт" больш увагі надае вулічнай актыўнасці. Таму іх ведаюць, на жаль, канешне, па затрыманнях, па крымінальных прысудах, па ціску. А "Моладзь БНФ" прадстаўлена ў вачах грамадскасці ў якасці імпрэзаў, дыскаў, музыкі.

**— Назаві, калі ласка, тры рэчы, якія не падабаюцца табе ў палітыцы дзяржавы?**

— Непавага да свайго сапярніка, хлусня і непрафесіяналізм тых людзей, якія займаюць высокія пасады.

**— А калі б ты стаў прэзідэнтам Беларусі, што найперш зрабіў бы?**

— Спачатку прызначыў бы выбары ў новы парламент. Потым, як гэта ні смешна выглядае, абмежаваў бы свае паўнамоцтвы.

**— Як ты ставішся да знакамітай беларускай памяркоўнасці?**

— Я лічу, што вельмі хутка наша "памяркоўнасць" будзе змяншацца. На мой погляд, усё залежыць ад эканамічнай сітуацыі. Людзям складана выйсці на плошчу. Многія банальна баяцца, што іх звольняць з працы, выключаць з універсітэта. Але тады, калі ў людзей не будзе сродкаў, каб набыць адзенне, ежу, аплаціць вучобу дзецям, яны будуць змагацца за свае правы. Тады ўсе будуць стаяць разам.

**— 25 сакавіка цябе затрымалі на плошчы, раскажы, як усё адбывалася?**

— Спачатку нам падавалася, што акцыя будзе мірнай, спакойнай, што нам дазволяць прайсціся па галоўных вуліцах горада і ўскласці кветкі ля помнікаў вялікіх людзей, якія аддалі сваё жыццё дзеля Беларусі. Але ўлада выкарыстала АМАП...

**— Як ты лічыш, што нас чакае ў будучым?**

— Як казаў Чэрчыль: "Палітык павінен заўсёды рабіць прагнозы, але самае галоўнае, ён павінен адказваць, чаму яго прагнозы не збыліся". Таму я пакуль устрымаюся ад прагнозаў...

**Лілія ВАЛКОНСКАЯ.**

Народная Воля http://www.nv-online.info
1 МАЯ 2008 г.

МНЕНИЕ

## Кому нужен такой референдум?

Уважаемая редакция!

В трех номерах "Народной воли" были напечатаны статьи, в которых убедительно доказывалась несостоятельность плана строительства АЭС в Беларуси. И в заключение своей публикации физик Юрий Воронежцев выдвигает идею проведения референдума по вопросу строительства АЭС. И это вызывает по меньшей мере удивление, потому что сам автор подчеркивает: "сам процесс голосования подвержен манипуляциям". У всех нас на памяти все проведенные в прошлом референдумы. Так что, надо провести еще один такой референдум, чтобы это строительство было узаконено "волей народа"?

Может быть, хотя и с опозданием, надо было бы начать информационную кампанию, чтобы люди знали, что собой представляет АЭС, ее строительство, эксплуатация и наши возможности. И использовать для этого и независимую прессу, и листовки, распространяемые, где только возможно, и устную информацию кандидатов от демократических сил в период избирательной кампании в "палатку". Конечно, наивно надеяться, что это сможет повлиять на ход дела, но люди хотя бы будут знать, какое совершается преступление.

С уважением —

**М.ДУБЕНЧУКОВ,**
**житель Минской области.**

ЧУЛІ?

## Школьнікам скароцяць канікулы?

Міжведамасная камісія разглядае пытанне пра магчымае скарачэнне працягласці школьных летніх канікулаў. На сёння існуюць тры варыянты скарачэння.

Старшыня камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Здановіч кажа, што такое падаўжэнне выклікана пераходам на 11-годку. *"Гэта толькі меркаванне пакуль. Канчатковае рашэнне яшчэ не прынятае,* — гаворыць Здановіч.— *Яно будзе, магчыма, замацоўвацца з дапамогай дэкрэта прэзідэнта. Пакуль працуе група, якая абмяркоўвае ўсе магчымыя нюансы такога павелічэння працягласці навучальнага года".*

Па словах У.Здановіча, частка экспертаў прапаноўвае падоўжыць вучэбны год да 10 чэрвеня, яшчэ адна група экспертаў — да сярэдзіны чэрвеня. Ёсць таксама прапановы падоўжыць вучэбны год на ўвесь чэрвень.

SOS!

## Дапаможам ТБМ!

Паважаныя сябры і прыхільнікі роднай беларускай мовы! Да вас звяртаецца сакратарыят ТБМ з просьбай аб дапамозе.

Паводле новага Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, з 24 красавіка гэтага года кошт арэнды за сядзібу ТБМ павышаецца ў 10 (!) разоў і дасягне 846,5 еўра ў месяц. Акрамя таго, мы мусім аплачваць тэлефон, камунальныя і паштовыя паслугі.

Нягледзячы на шматлікія звароты грамадзян Беларусі ў Адміністрацыю і Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта з просьбай пакінуць для ТБМ ранейшы кошт арэнды, 16 красавіка мы атрымалі адмоўны адказ.

Такое грамадскае аб'яднанне, як ГА "Таварыства беларускай мовы", мэта якога — садзейнічанне набыццю беларускай мовай рэальнага статуса дзяржаўнай, не надта патрэбнае сённяшняй уладзе, бо размаўляць і працаваць на роднай мове тытульнай нацыі краіны яна ўпарта не жадае, ігнаруючы тым самым асноўны закон краіны — Канстытуцыю.

Для таго каб утрымаць сядзібу арганізацыі ў Мінску ў гэтых умовах, нам неабходна штомесяц збіраць 5 мільёнаў беларускіх рублёў у выглядзе ахвяраванняў і складак сяброў і прыхільнікаў ТБМ. Калі пяць тысяч прыхільнікаў роднай мовы ахвяруюць штомесяц усяго адну тысячу рублёў, наша арганізацыя не загіне і ў каторы раз прадэманструе сённяшняй уладзе сваю годнасць. Імёны асобаў, якія ахвяруюць пасільныя сродкі на выратаванне ТБМ, будуць надрукаваны ў газеце "Наша слова", што стане сведчаннем змагання грамадзян за правы "людзьмі звацца".

**Рахунак ГА "ТБМ імя Францішка Скарыны" №3015212330014 у Гардырэкцыі ААТ "Белінвестбанк", код 764.**

ЗАПАВЕТНАЕ

# Жывая крыніца ты, родная мова

**Мікалай КРЫЖАНОЎСКІ,**
*дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 12-га склікання*

### Задушэнне

На пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, калі ў нашай краіне нарэшце з'явілася магчымасць адчыняць беларускія школы, праз нейкі час было заўважана: беларускія дзеці ў беларускіх школах на роднай мове больш паспяхова вучацца, лепш засвойваюць матэрыял і лепш развіваюцца, чым у рускіх школах. Прыкладам — легендарны Беларускі нацыянальны гуманітарны ліцэй імя Якуба Коласа, у якім навучальны працэс ішоў выключна па-беларуску. На працягу некалькіх гадоў існавання ліцэя ўсе ягоныя выпускнікі (100 працэнтаў, і гэта вядомы факт!) без праблем паступалі ў любыя ўпадабаныя імі ВНУ. Аднак у 2003 годзе ліцэй быў зачынены уладай без абгрунтавання прычын. А можа, прычына была ў тым, што гэтай уладзе такія дзеці не патрэбны?

Сёння ў Беларусі няма ніводнай цалкам беларускамоўнай школы. І няма больш ніводнага прыкладу стопрацэнтнага паступлення ў ВНУ выпускнікоў адной школы ці хаця б аднаго класа.

...Яшчэ ў 1922 годзе наш класік Змітрок Бядуля напісаў свае знакамітыя "Дзесяць загадаў для памяці". Вось адзін з іх: *"Толькі ў роднай, добра зразумелай мове, чалавечы розум развіваецца і багаціць родную духоўную і эканамічную культуру".*

Навуковымі даследаваннямі ўстаноўлена, што разумовыя і творчыя здольнасці чалавека найлепш выяўляюцца ў роднай для яго мове. Родная мова — гэта чароўны скарб, у якім сабраны духоўнае багацце, культура, традыцыі, інтэлект, мудрасць і кемлівасць усіх пакаленняў продкаў, скарб, які вечна жыве ў неўміручай памяці народа.

Святое Евангелле паводле Яна сведчыць: *"Напачатку было слова".* Менавіта праз матчына слова пачынае дзіцятка пазнаваць усё, што знаходзіцца вакол яго, людзей, прадметы, асяроддзе, Радзіму, сусвет. Праз матчына слова выхоўваюцца і адносіны да ўсяго, што яго акружае.

А калі маці размаўляе з дзіцяткам на чужой мове? Ці зможа яна перадаць яму ўвесь духоўны, культурны і інтэлектуальны скарб, які стагоддзямі збіралі і бераглі многія пакаленні продкаў? Як ні горка казаць, але ў такім выпадку дзіця застанецца абкрадзеным найперш сваёй жа маці, якая не перадала яму гэты чароўны скарб, абмежаваўшы разумовыя і творчыя здольнасці сына ці дачкі.

Народ і яго мова жывуць і развіваюцца, як адзіны жывы арганізм. Народ не можа існаваць без роднай мовы, як і яна не можа існаваць без свайго носьбіта — народа.

...Беларуская мова цягам многіх стагоддзяў была дзяржаўнай у нашай старажытнай дзяржаве — Вялікім княстве Літоўскім. На ёй гаварылі і пісалі ўсе галоўныя асобы і большасць насельніцтва Вялікага княства. На ёй напісаны і выдадзены Статут Вялікага княства Літоўскага — на той час самы перадавы кодэкс законаў у Еўропе, які замацоўваў дзяржаўны суверэнітэт, грамадскі і дзяржаўны лад, правы і абавязкі жыхароў, прынцыпы судовага ладу. Статут заканадаўча сцвярджаў ідэю рэлігійнай талерантнасці і бараніў правы ўсіх жыхароў, незалежна ад іх веравызнання. Гэта якраз тое, што пакладзена ў аснову канстытуцый сучасных дзяржаў цывілізаванага свету.

Пасля ліквідацыі і гвалтоўнага ўключэння нашых земляў у 1795 годзе ў склад Расійскай імперыі пачалося рашучае вынішчэнне ўсяго беларускага. Каб увекавечыць тут сваё панаванне, Расія афіцыйна адмаўляла беларускую нацыю і беларускую мову. Галоўным накірункам палітыкі яе ўлад была русіфікацыя ў Беларусі. Школьнае навучанне і справаводства адразу былі пераведзены на рускую мову. Чыноўнікаў беларускага паходжання звальнялі з дзяржаўных устаноў, замяняючы іх расійскімі. Тысячы чыноўнікаў хлынулі з цэнтральных расійскіх губерній у нашы гарады і мястэчкі. Паплечнік Віленскага генерал-губернатара М.Мураўёва-"вешальніка" І.Нікоцін пацвярджаў: *"Русские чиновники ежедневно приезжают сюда со всех концов России и поступают на службу; родная русская речь стала слышаться всюду".*

Асабліва шмат ехала папоў. Пачалася ліквідацыя уніяцтва, якое ў той час вызнавала больш за тры чвэрці нашага насельніцтва. Гэтым займалася мясцовая расійская адміністрацыя, прадстаўнікі якой заяўляліся ў парафіі з праваслаўнымі святарамі ў суправаджэнні салдатаў і пад прымусам перахрышчвалі сялян. Толькі за адзін год было перахрышчана ў праваслаўных каля паўтара мільёна беларускіх уніятаў! А праваслаўныя святары з Расіі заўсёды верай і праўдай "служили царю и российскому отечеству". Варта нагадаць, што менавіта гэты накірунак сваёй дзейнасці нядаўна публічна пацвердзіў мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт пры атрыманні дзяржаўнай узнагароды ад расійскага прэзідэнта У.Пуціна. Аддаўшы таму падзяку, ён сказаў: "Служу российскому отечеству!" Пры гэтым галоўны праваслаўны святар нашай краіны не ўспомніў ні Бога, ні беларускіх вернікаў...

У 1840 годзе на нашай тэрыторыі было скасавана дзеянне Статута Вялікага княства Літоўскага і забаронена выкарыстанне ў справаводстве назвы "Беларусь". Яна мусіла называцца "Северо-Западным краем". Гэтак рускі царызм імкнуўся ліквідаваць гістарычна-культурную адметнасць нашай Бацькаўшчыны, ператварыць яе ў "исконно русские земли". Толькі за адно стагоддзе свайго панавання царызм давёў беларускую мову да такога становішча, што ў пачатку XX стагоддзя не стала **ніводнай беларускай школы**.

### Усплёск

Ігнаруючы праўдзівыя гістарычныя факты, ворагі сцвярджалі і сцвярджаюць, нібыта беларусы самі адмаўляюцца ад сваёй мовы. Але праўда ў тым, што, як толькі мы вызваляліся ад "братэрскіх" абдымкаў усходняга суседа, адразу ж пачыналася адраджэнне беларускай мовы!

У ноч з 24 на 25 сакавіка 1918 года Рада Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР) прыняла Трэцюю ўстаўную грамату, у якой абвяшчала Беларусь незалежнай і вольнай дзяржавай і скідала *"апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасці, якое гвалтам накінулі рускія цары".* Пачалася практычная дзейнасць па адраджэнні беларускай мовы, якая стала дзяржаўнай. Пры Народным сакратарыяце асветы было створана бюро для падрыхтоўкі школьных падручнікаў і таварыства "Прасьвета", якое займалася іх выпускам. Былі арганізаваны курсы для настаўнікаў і школьная інспекцыя, пашырана сетка пачатковых і сярэдніх школ. Толькі ў Менску было адкрыта 20 беларускіх школ. Колькасць жа ўсіх беларускіх школ на Меншчыне дасягнула тады 193. Было адкрыта 13 беларускіх гімназій.

У Віцебску ў 1918 годзе адкрылася Беларуская народная кансерваторыя, у Менску — Каталіцкая духоўная семінарыя з беларускай мовай навучання. Паводле дадзеных Аўгена Калубовіча ў яго працы "Крокі гісторыі", у 1918 годзе на заходніх землях Беларусі працавала больш за 350 беларускіх школ, у 1920-м колькасць іх дайшла да 514.

Камісія народнай асветы 1-га Усебеларускага кангрэса выказалася за неадкладнае адкрыццё Беларускага універсітэта, сельскагаспадарчага інстытута і Політэхнікі. Пачалася падрыхтоўчая работа...

У БНР выходзіла рэкордная для той пары колькасць беларускіх газет і часопісаў (14).

Гэтак пачыналася беларускае адраджэнне ў пачатку XX стагоддзя.

### Выгнанне

Але неўзабаве на Беларусь вярнулася расійска-савецкая ўлада, яна адразу пачала таптаць першыя парасткі беларускага адраджэння, што ўзышлі падчас кароткага існавання БНР. Разгарнуліся рэпрэсіі супраць беларусаў, асабліва супраць нацыянальнай інтэлігенцыі. Дзесяткі, сотні, тысячы лепшых людзей былі расстраляны ў Курапатах ды іншых месцах масавага знішчэння або бязвінна загінулі на бязмежных абшарах савецкай імперыі ад холаду, голаду, хвароб ды тугі па Радзіме.

Потым савецкая ўлада ажыццявіла ганебную рэформу нашай мовы дзеля яе уніфікацыі з рускай. У выніку беларуская мова шмат страціла ў сваёй мілагучнасці, мяккасці, самабытнасці і нацыянальным каларыце.

Старанна спланаванае, паслядоўнае і мэтанакіраванае выгнанне роднай мовы з усіх куточкаў беларускага дому прывяло да поўнай ліквідацыі ў нашай краіне беларускага навучання і беларускага справаводства.

Як ні дзіўна, але ў цяжкую гадзіну ваеннага ліхалецця ў нашай краіне пачалі адкрывацца беларускія школы. Богаслужэнне ў царквах і касцёлах праводзілася выключна па-беларуску...

Пасля вайны цэрквы і касцёлы былі зачынены, хаця беларускія школы ў некаторых месцах пэўны час яшчэ існавалі. Але ў пачатку 50-х гадоў мінулага стагоддзя пачаўся асабліва рашучы наступ на ўсё беларускае, перш за ўсё на беларускую мову, якая яшчэ трымалася сярод беларускай інтэлігенцыі і значнай часткі вяскоўцаў.

Наступная хваля адраджэння прыйшла на пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, калі пачаўся развал расійска-савецкай імперыі і ёй стала не да нас. Пачалі адкрывацца беларускія школы. Выхавацелі дзіцячых садкоў вучылі дзяцей гаварыць па-беларуску, спяваць беларускія песні, і тыя рабілі гэта з ахвотай і радасцю. На прадпрыемствах і ў дзяржаўных установах адкрыліся курсы па вывучэнні мовы. Яна загучала ў Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь 12-га склікання. На вялікі жаль, гэтая хваля адраджэння была гвалтоўна спынена адразу ж пасля абрання першага прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Пачаўся новы, яшчэ больш рашучы наступ на ўсё беларускае, на галоўныя нашы нацыянальныя каштоўнасці: мову, культуру, праўдзівую гісторыю, старажытны герб "Пагоня" і святы бел-чырвона-белы сцяг.

### Новы наступ

Русіфікатары шмат дасягнулі ў ажыццяўленні сваёй мэты. Кіруючыя асобы краіны і значная частка насельніцтва не размаўляюць і не пішуць на беларускай мове. Амаль не чуваць яе ў дзіцячых садках, школах, вышэйшых навучальных установах, на прадпрыемствах, тэлебачанні. Зусім няма яе ў кабінетах дзяржчыноўнікаў.

На самым высокім узроўні адкрыта дэманструецца непавага да тытульнай нацыі. Яшчэ на пачатку сваёй дзейнасці ў якасці прэзідэнта А.Лукашэнка зрабіў праграмную заяву, у якой сказаў: *"Люди, которые говорят на белорусском языке, не могут делать ничего, кроме как разговаривать на белорусском языке, потому что по-белорусски нельзя выразить ничего великого. Белорусский язык — бедный язык. В мире существуют только два великих языка — русский и английский".* У любой цывілізаванай краіне за такую абразу роднага слова прэзідэнт мог бы згубіць крэсла, але толькі не ў нас, дзе дзяржава фактычна выхоўвае манкуртаў. А таму для любога начальніка і нават звычайнага чыноўніка гэтыя словы прагучалі як дырэктыва, закон. Ці не таму ні кіраўнік урада, ні міністры, ні вертыкальшчыкі, - ніхто з высокіх дзяржаўных асоб публічна не ўжывае мову тытульнай нацыі? Такога няма больш нідзе ў свеце.

### Дар ад Бога

Наша мова дадзена нам Богам. Варта толькі паслухаць, як гучаць на роднай мове назвы месяцаў, як дакладна і прыгожа ў гэтых назвах увасоблена адпаведная ім пара года.

Ці паслухайма і параўнайма такія словы, як "раніца" — утро, "свята" — праздник, "перамога" — победа, "вячэра" — ужин, "вяселле" — свадьба, "сякера" — топор, "агародніна" — овощи, "садавіна" — фрукты, "надвор'е" — погода, "стрэльба" — ружье, "перавага" — преимущество, "крывадушнасць" — лицемерие і гэтак далей. Наколькі ярка ў нашай мове адлюстраваны сэнс і змест кожнага з гэтых паняццяў!

Яна спеўная, выразная, дакладная і вельмі багатая. Пачытайце, панове, творы Францішка Багушэвіча, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага, Ларысы Геніюш, Наталлі Арсенневай, Уладзіміра Караткевіча, Васіля Быкава, Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна ды іншых беларускіх паэтаў і пісьменнікаў. Можа, тады вы ўбачыце, колькі вялікага і прыгожага створана на беларускай мове!

Успамінаю, як аднойчы ехаў я электрычкай у Жодзіна. Маёй спадарожніцай аказалася знаёмая жанчына, мы гаварылі з ёй па-беларуску. Праз некаторы час да нас падышла незнаёмка, што сядзела недалёка, і папрасіла: "Ці можна, я прысяду каля вас і паслухаю, як вы размаўляеце, вельмі мне падабаецца! Я сама беларуска, але, на жаль, не магу добра размаўляць на сваёй мове, а яна такая прыгожая, як песня". Каментарыі тут не патрэбны.

*"Беларуская нацыя існуе, пакуль жыве беларуская мова. Калі мы хочам захавацца як нацыя, мы павінны берагчы сваю родную мову".* Гэтыя словы Зянона Пазьняка гучаць як папярэджанне ўсім беларусам. Нездарма ж акупанты заўсёды імкнуліся адабраць у акупіраваных народаў іх мову, замяніць яе сваёй, усталяваць кантроль над імі, пазбавіць іх пачуцця нацыянальнай годнасці, самастойнасці і волі да супраціўлення. Так рабілі брытанскія каланізатары ў Індыі, Аўстраліі, Канадзе, іспанскія — у краінах Лацінскай Амерыкі, партугальскія — у Бразіліі. Такую ж палітыку ажыццяўляюць расійскія імперцы ў краінах былога СССР, асабліва паспяхова — у Беларусі.

У сваёй працы "Нацыянальныя каштоўнасці" Зянон Пазьняк, адзначаючы багацце нашай мовы, напісаў: *"Чым я найбольш захапляюся ў Беларускай мове, гэта яе вобразнасцю і ёмкасцю слова (і па змесце, і па гучанні). Другое, што мне надта падабаецца, гэта шматварыянтнасць гучання і напісання словаў, і потым — багацце сінонімаў.* ***Тут рай для паэтаў****, можна плаваць, купацца, плюскацца ў такой багатай мове, было б толькі што казаць".*

Дарэчы, і ў нашай мове ёсць слова "язык", але яно мае іншае значэнне, бо мова мае асаблівы статус недатыкальнасці, асаблівую велічную назву. Яе нельга прыраўняць ні да якой іншай рэчы.

Дык што ж трэба рабіць беларусам, каб захавацца як нацыі?

Трэба, паважаючы чужое, любіць і берагчы ўсё сваё, роднае, беларускае: прыроду, культуру, гісторыю, традыцыі, звычаі, нацыянальныя сімвалы, свае песні, свае казкі, сваю мову — гэты чароўны скарб, у якім сабраны духоўнае багацце, інтэлект, мудрасць і кемлівасць усіх пакаленняў нашых продкаў.

Трэба не саромецца гаварыць па-свойму, мовай бацькоў і дзядоў сваіх, бо гэта вялікі нацыянальны скарб.

Трэба верыць у адраджэнне роднай мовы. Упэўненасць нам дае тое, што апантаныя русіфікатары так і не здолелі знішчыць нашу мову, нягледзечы на ўсе іх намаганні на працягу больш як 200 гадоў. Наша мова жыве! На ёй беларуская моладзь здае ўступныя экзамены ў ВНУ. Голас продкаў падказвае ім, што ў роднай мове — аснова іх поспеху і надзея на лепшую долю. Таму з такой радасцю сотні і тысячы беларусаў пісалі і працягваюць пісаць Першую агульнанацыянальную дыктоўку з прарочымі словамі Францішка Багушэвіча: **"Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!"** Трымайцеся гэтага запавету — і тады мы пераможам, і будзе вечна жыць Беларусь.

СКАЖЫ, ВІТАЛЬ...

## Уласную пенсію можна павялічыць

**Недзе чула, што ў Беларусі існуе норма, згодна з якой працуючы пенсіянер, які адмаўляецца ад яе атрымання, потым атрымлівае пенсію ледзьве не на 50% большую. Ці так гэта?**

**Маргарыта Палойкіна,**
**працуючы пенсіянер, Віцебск.**

— Так, але размова ў бальшыні выпадкаў ідзе далёка не аб 50-працэнтным павышэнні. На адной з прэс-канферэнцый начальнік галоўнага ўпраўлення пенсіённага забеспячэння Міністэрства працы і сацыяльнага страхавання Валянціна Каралёва паведаміла, што пры такім падыходзе значна павялічваецца важнасць стажу і не ўстанаўліваецца максімальнае абмежаванне пенсіі ў памеры 75% ад заробку. Чалавек дасягае пенсіённага ўзросту і працягвае працаваць, не афармляючы пенсіі. За кожныя 2 месяцы яго працы ў гэты перыяд памер яго пенсіі павялічваецца на 1 працэнт заробку.

На практыцы гэта выглядае наступным чынам: напрыклад, жанчына дасягнула пенсіённага ўзросту і мае працоўны стаж 38 гадоў. Згодна з беларускім заканадаўствам, пенсія ёй будзе прызначана ў памеры 73% ад заробку, прынятага для налічэння пенсіі. Калі яна адмовіцца атрымліваць пенсію цягам аднаго года, то яе пенсія павялічыцца на 7% і будзе складаць 80% ад заробку.

Па словах той жа Каралёвай, у Беларусі ёсць прыклады, калі пенсія складае ажно 103% ад заробку.

## Хачу пластыкавую картку

**Мне 16 гадоў. Ці магу я аформіць сабе пластыкавую картку ў "Беларусбанку"? Якія дакументы для гэтага патрэбны?**

**Дзмітрый Камароў, Мінск.**

— У "Беларусбанку" нам адказалі, што гэта магчыма, пластыкавую картку вы сабе можаце аформіць. Яны дазваляюцца асобам, якія дасягнулі 14-гадовага ўзросту. Для адкрыцця карт-рахунку неабходна прадаставіць пашпарт.

## Папярэднае сумоўе — беларускае «ноу-хау»

**Нядаўна даведалася, што ўведзены новы метад адбору будучых студэнтаў. Маю на ўвазе правядзенне сумоўя, напрыклад, для будучых журналістаў. Лічу гэта сапраўднай дыскрымінацыяй, якая пазбаўляе людзей права самастойна выбраць сабе прафесію. На мой погляд, гэта робіцца для таго, каб адабраць ідэалагічна "правільных" маладых людзей. Цікава, а хто аўтар гэтай прапановы, і ці ёсць нешта падобнае ў іншых краінах?**

**Р.В.Рубінчык, Мінск.**

— Канкрэтнае прозвішча аўтара гэтага новаўвядзення назваць складана. Аднак ідэя аб папярэднім сумоўі перад здачай экзаменаў нарадзілася ў сценах Міністэрства адукацыі Беларусі. Як вядома, у нашай краіне ледзьве не кожны год правілы прыёму студэнтаў у ВНУ змяняюцца. Вось і зараз уведзена ноу-хау. Пазней прапанова была зацверджана Саветам міністраў і Адміністрацыяй прэзідэнта.

Цікава, што профільнае сумоўе праводзіцца да пачатку здачы экзаменаў у ВНУ. Беларусь у гэтым сэнсе — першая краіна, якая адважылася на такі крок. Так, практыка сумоўяў пры паступленні ў ВНУ існуе амаль паўсюдна. У абітурыента пытаюцца, чаму ён абраў менавіта гэтую прафесію. Аднак гэта адбываецца падчас ці пасля здачы ўступных іспытаў, а не задоўга да іх здачы.

## Тры дні — і дом папалам

**Маю дом, які набыты да шлюбу, але зарэгістраваны ў БТІ на трэці дзень пасля рэгістрацыі шлюбу. Пры разводзе суд нам падзяліў дом на дзве роўныя часткі. Ці магу я вярнуць ва ўласнасць другую частку дома?**

**Міхаіл Кавалёнак, Маладзечненскі раён.**

— У Законе аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай уласнасці напісана, што здзелка з нерухомай маёмасцю лічыцца заключанай з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі, калі іншае не прадугледжана заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь. Такім чынам, ваш дом з'явіўся ў вас у час шлюбу.

А ў Кодэксе аб шлюбе і сям'і пазначана: "Маёмасць, якая нажыта мужам і жонкай у перыяд шлюбу, незалежна ад таго, на каго з іх яна афармлена, ці кім унесены грашовыя сродкі, з'яўляецца іх агульнай уласнасцю. Муж і жонка карыстаюцца роўнымі правамі на карыстанне, уладанне ці распараджэнне гэтай маёмасцю, калі іншае не прадугледжана шлюбным дагаворам.

Так што трэба было ці спяшацца да шлюбу дом зарэгістраваць, ці наогул не спяшацца з жаніцьбай.

**Свае пытанні ў рубрыку дасылайце на адрас: 220030, Мінск, вул.Энгельса 34а, рэдакцыя газеты "Народная воля" з паметкай "Скажы, Віталь...".**

**Вядучы рубрыкі Віталь ГАРБУЗАЎ.**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## Не суд — тэатр

Суд Маскоўскага раёна сталіцы прызнаў законным звальненне актрысы Ганны Саламянскай з Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Горкага.

Суд адмовіў актрысе ў іскавых патрабаваннях: прызнанні незаконным яе звальнення з тэатра, а таксама спагнанні з тэатра 10-разовага памеру яе сярэдняга заробку. А.Саламянская была звольнена з тэатра ў лютым гэтага года пасля заканчэння тэрміну працоўнага дагавора.

Адказчык — прадстаўнік тэатра — патлумачыў непадаўжэнне працоўнага дагавора незанятасцю актрысы ў рэпертуары.

У сваю чаргу А.Саламянская паведаміла, што за апошнія тры гады яна не была выклікана ні на адну новую ролю, а спектакль, у якім яна іграла галоўную ролю, быў зняты з рэпертуару. Актрыса зазначыла, што працавала ў тэатры з 1996 года, і ўвесь гэты час з ёю заключаліся тэрміновыя працоўныя дагаворы. На думку А.Саламянскай, яе праца насіла пастаянны характар, аднак кіраўніцтва тэатра не прапанавала ёй заключыць кантракт. У момант звальнення яе малодшаму дзіцяці не споўнілася 5 гадоў.

Як паведаміла БелаПАН А.Саламянская, яна не згодная з рашэннем суда і мае намер аспрэчваць яго ў вышэйстаячых інстанцыях.

Апошнія тры гады А.Саламянская супрацоўнічае са "Свабодным тэатрам" — незалежным тэатральным калектывам. "Свабодны тэатр" не мае ў краіне фінансавання, уласнай сцэны і памяшканняў для рэпетыцый. Калектыў актыўна гастралюе за мяжой і вядомы як тэатр, які ўзнімае ў сваёй творчасці вострыя грамадска-палітычныя тэмы.

**Таццяна ДАРАШЧОНАК.**

## Дыктоўку пісалі пад вокнамі суда

Агульнанацыянальная акцыя "Беларуская дыктоўка" працягваецца. Падчас судовага працэсу над чатырнаццаццю маладымі змагарамі за дэмакратычную Беларусь пад вокнамі суда Цэнтральнага раёна г.Мінска дыктоўку пісалі маці і бацькі тых, хто колісь вучыўся ў гэтым будынку. Удзельнікі дыктоўкі хацелі трапіць у суд, але іх не пусцілі не толькі ў залу, але нават і ў будынак. Пісалі на лаве пад вокнамі.

Арганізавала дыктоўку і дыктавала Галіна Іосіфаўна СІЎЧЫК. Сярод удзельнікаў быў Уладзімір Падгол, які пісаў пад вокнамі кабінета, дзе падчас існавання ліцэя Якуба Коласа выкладаў паліталогію.

**Андрэй КАЗЛОЎ.**

ВОЗВРАЩАЯСЬ К НАПЕЧАТАННОМУ

# Об абстрактном диалоге в «Открытом письме»

**Бывают случаи, когда к опубликованным материалам приходится возвращаться и через полгода, и через год. Вот и сейчас мы вынуждены вспомнить Открытое письмо Президенту Республики Беларусь жителя г.п.Копысь Оршанского района В.И.Нездерова, напечатанное 23 августа 2007 года.**

В той публикации приводился наряду с другими фрагмент диалога бывшего учителя Копысской средней школы В.И.Нездерова с земляком, Президентом страны А.Г.Лукашенко, в ходе которого первый укорял многих, в том числе и за резко усложнившиеся проблемы в льноводстве. При этом Нездеров, очевидно, ненароком назвал тогда и фамилию другого земляка, работающего ныне директором РУП "Институт льна", Заслуженного работника сельского хозяйства Республики Беларусь, доктора сельскохозяйственных наук И.А.Голуба. До этого он был председателем колхоза, 15 лет работал директором экспериментальной базы "Устье", возглавлял Оршанский райисполком и вот уже семь лет руководит созданным им же в сельской глубинке, в основной зоне льносеяния, исследовательским учреждением, которое занимается научным обеспечением, пожалуй, одной из самых проблемных отраслей агропромышленного комплекса - льноводства. И коренные изменения в этой отрасли начались.

Данный фрагмент "Открытого письма..." Иван Антонович Голуб посчитал в определенной море подрывом своего заслуженного авторитета, нанесением ему морального вреда. На его взгляд, отдельные пассажи ставят под сомнение его достоинства и как ученого-организатора, и как специалиста. Что касается автора "Открытого письма...", то он подтвердил редакции, что ни в коем случае не имел в виду конкретно И.А.Голуба, когда отвечал на вопрос Президента Республики Беларусь А.Г.Лукашенко об ученых и их учености, отвергает любые инсинуации тех, кто, спекулируя публикацией, желает бросить тень на имя И.А.Голуба.

Поэтому если у кого-либо из читателей возникло малейшее сомнение в этом, редакция готова сделать решительное заявление: никакой "привязки" к уважаемому И.А.Голубу здесь нет и быть не может. Приносим извинения доктору сельскохозяйственных наук И.А.Голубу за возможно причиненный психологический дискомфорт.

Будем надеяться, что, вернувшись к напечатанному, редакция газеты "Народная воля" расставила все точки над "і". Остается лишь пожелать Ивану Антоновичу крепкого здоровья и успехов в научной деятельности.

**Редакция газеты "Народная воля".**

Народная Воля http://www.nv-online.info
1 МАЯ 2008 г.

# События в мире: европейский взгляд

## Почему Россия боится НАТО?

**В действительности российская элита больше всего боится не военной угрозы НАТО, а того, что альянс несет с собой демократизацию.**

"Номенклатура в погонах органически не переносит демократию. Она боится одного: что ей, ставящей себя над законом, придется играть по общеустановленным, а не по своим собственным правилам", — объясняет Андрей Миронов из правозащитной ассоциации "Мемориал".

В Киеве, как и в Тбилиси, вступление в НАТО рассматривается правящими кругами как возможность присоединиться к демократическому пространству Старого континента. Статус кандидата на вступление не является гарантией демократизации, но требования, которые необходимо выполнить в преддверии вступления, способствуют насаждению демократии, в первую очередь в армии. В этой сфере Украина и Грузия опережают Россию.

Людям в погонах в Кремле надо бы задуматься: "Почему бывшие вассалы Москвы так спешат покинуть общее пространство безопасности? Почему, как говорит экс-министр обороны Украины Анатолий Гриценко, "кандидаты толпятся у дверей НАТО, а не ОДКБ", военного соглашения постсоветского периода?"

Российской элите совершенно чужда идея привлекательности, она способна мыслить исключительно в терминах баланса сил, эмбарго, шантажа и угроз. Именно эта тенденция преобладала на протяжении двух сроков правления Владимира Путина, с 2000-го по 2008 год.

Последствия оказались катастрофическими. Чем чаще Россия показывает зубы, тем сильнее ее периферия хочет присоединиться к НАТО. Присутствие на саммите в Бухаресте еще двух глав государств Средней Азии — Ислама Каримова из Узбекистана и Гурбангулы Бердымухаммедова из Туркмении, — стремящихся к более тесному сотрудничеству с альянсом, подтверждает эту тенденцию.

"Сила убеждения", или влияние через культуру и идеологию, скорее, чем военные или энергетические рычаги, могла бы дать России шанс при условии ее отказа от имперских амбиций. Была бы даже определенная логика в том, чтобы Грузия и Украина, очень близкие Москве в культурном и лингвистическом плане, строили бы привилегированные отношения со своим бывшим сюзереном. Ничего подобного не происходит, потому что российская элита понимает только один язык — язык силы. Ценности — пустяки для успокоения народных масс.

**Мари ЖЕГО.**
*Le Monde.*

У СОСЕДЕЙ

## Поляки едут домой

*В Польшу начали возвращаться многочисленные мигранты, уехавшие на заработки в Великобританию и Ирландию после вступления страны в ЕС.*

При этом Польше своей рабочей силы все равно не хватает. Она вынуждена привлекать гастарбайтеров из соседних стран.

Недавно Институт рыночных исследований провел опрос среди поляков, работающих в Великобритании и Ирландии.

Выяснилось, что количество желающих вернуться домой выросло в два раза по сравнению с прошлым годом. Тогда об этом заявили 6% опрошенных, сейчас — 12%. Правда, при этом 75% не собираются возвращаться на родину в течение ближайшего года. Половина респондентов не планирует ехать в Польшу и через несколько лет.

Польские СМИ сообщают о "массовом возвращении поляков". Публикуют интервью с вербовщиками, приезжающими в Польшу с Британских островов в поисках рабочей силы. Те отмечают спад интереса к своим предложениям. При этом подчеркивают, что сейчас уже польские фирмы ищут своих соотечественников, работающих в Великобритании и Ирландии, чтобы предложить им работу на родине.

В агентствах по трудоустройству в Варшаве BBCRussian.com сообщили, что сейчас к ним обращается много людей, недавно вернувшихся из-за границы. Агентства также ощутили возросший интерес со стороны тех, кто продолжает работать за рубежом. Еще находясь за границей, они уже начинают подыскивать себе рабочие места в Польше.

Есть несколько основных причин, по которым поляки потянулись домой. В опросе названного института главной причиной была названа тоска по дому, родным и друзьям. Отмечается также, что за последнее время рынок труда в Великобритании и Ирландии насытился. Найти подходящую работу стало сложнее. Польские мигранты также жалуются на условия труда, часто достаточно жесткие.

Давялося коратка расказаць, як адмовіўся ад пасады дырэктара Касцюковіцкага раённага Дома культуры: трэ было рабіць рамонт, памяшканне вялізнае, як гумно, а ў ваенкамаце сказалі: па восені пойдзеш у войска. Райкам партыі сваё: у армію не адпусцім, ты нам патрэбны. А я заяву на стол. На сваё месца прапанаваў мастацкага кіраўніка, чалавека ўдвая старэйшага, — мне тады і дваццаці не было, а ён вопытны гаспадарнік. Перастанаўка адбылася. Па восені ўжо быў на Балтыцы. А ў 1974 годзе Кастусь Кірэенка ўгаварыў перайсці з "Немана" да яго ў "Полымя" адказным сакратаром. Вытрымаў восем месяцаў. Кірэенка быў чалавек гарачы, непрадказальны, і як толькі пазявілася магчымасць перайсці на пасаду загадчыка рэдакцыі навукі і мастацтва, я гэта зрабіў — так бы мовіць, пайшоў на паніжэнне.

— У мяне было ўсё інакш, — Валянцін спахмурнеў, вусныперасмыкнуліся. — Мне падрэзалі крылы на самым узлёце. Я б ужо мог абараніць доктарскую, быць прафесарам, а не выконваючым абавязкі загадчыка выдавецкай рэдакцыі.

Цяпер ужо я супакойваў калегу: яшчэ не вечар, ён яшчэ шмат чаго зробіць.

— Не, Лявоне, я жыву з воўчым білетам. Ходу не даюць. Дый час ужо страчаны. Каб не Дубянецкі, ужо даўно б быў на тым свеце, як Мікола Прашковіч...

За ліфтам нас адшукала сакратарка: Валянціна выклікаў галоўны рэдактар.

Рабкевіч пазнаёміўся з Дубянецкім у выдавецтве "Беларуская энцыклапедыя". Ён працаваў загадчыкам рэдакцыі і літаратуры, мовы, фальклору і этнаграфіі, а Міхась Дубянецкі — адказным сакратаром. І калі Валянцін апынуўся без работы, ён падаў руку дапамогі — прызначыў рэдактарам, а праз год павысіў "нацдэма": зрабіў старшым рэдактарам, а яшчэ праз год выдаў загад аб прызначэнні Рабкевіча загадчыкам рэдакцыі, але гэты загад цэрберы з Камітэта па друку не зацвердзілі.

Думкі пра тое, кім ён мог ужо быць, колькі б артыкулаў, манаграфій выдаў, колькі б зрабіў для развіцця роднай мовы, колькі б кніг пераклаў з польскай, украінскай, рускай моваў — нібы ржавы цвік, вярэдзілі душу, не давалі заснуць начамі. І па даўняй славянскай звычцы Валянцін пачаў шукаць супакой у гарэлцы. Часам здараліся запоі, тады ён па тыдні, а то і па два не бываў у рэдакцыі. Даведаліся пра гэта ў Камітэце па друку, пачалі шпыняць Дубянецкага, патрабаваць, каб зняў Рабкевіча з пасады, але той не адступаў: "Рэдакцыя працуе. Усе планы выконваюцца. Рабкевіч чытае дома. Работнік ён высокай кваліфікацыі". І гэта была праўда.

У тыя гады мы бачыліся рэдка. Калі Валянцін паяўляўся ў рэдакцыі, то мусіў разграбаць стол ад рукапісаў, гарбеў па дзесяць гадзін. Выходзіў на некалькі хвілін зацягнуцца цыгарэтаю. Праўда, часам сустракаліся ў сталоўцы. У чарзе можна было перакінуцца словам пра жыццё-быццё. У жніўні 1986-га я набыў "жыгулёнка", Валянцін быў заўзятым аўтамабілістам. Цяпер нашы размовы пачыналіся з гэтай тэмы: "Ну, як машына? Не падводзіць? Новая машына, як маладая жонка, патрабуе ўвагі, догляду. А галоўнае, Лявоне, не ліхач. Дарогі нашы ведаеш — то яма, то канава. А яшчэ запомні правіла трох "Д": дай дурню дарогу", — дзяліўся сваім вадзіцельскім досведам Валянцін.

## IV

Зімою 89-га ўдалося мне выбрацца на колькі дзён у Дом творчасці "Іслач". Выраваўся, так бы мовіць, без адрыву ад службы. Мой статус змяніўся: у рэдакцыі прозы стварылі сектар публіцыстыкі, мяне прызначылі яго загадчыкам, а маім першым і адзіным памочнікам быў Міхась Герчык, вядомы пісьменнік, выдатны рэдактар. Сакратарыят Саюза пісьменнікаў прызначыў мяне галоўным рэдактарам зборніка нарысаў "Сучаснік", які выдаваўся штогод. Я мусіў хадзіць на планёркі і быць на працы чатыры дні — як пісьменнік меў адзін творчы дзень. Таму паехаў у Дом творчасці на сваёй машыне.

Неяк перад абедам патэлефанавала дзяжурная: "Перастаўце, калі ласка, сваю машыну. Снег трэба пачысціць". Я выйшаў на двор і сутыкнуўся з Рабкевічам.

— Мне Канановіч сказаў, што ты ўцёк у лес. Дык вось і я — следам за дзедам, — усміхаўся Валянцін.

Я ўзрадаваўся сустрэчы. Узрадаваў бадзёры настрой Валянціна, і быў ён цвярозы, як шкельца.

— Вось мая калымага, — Валянцін паказаў на белага "жыгулёнка", акуратнага, дагледжанага. Па ўсім было відно, што гаспадар клапоціцца пра свайго "коніка".

Змёў я снег са сваёй "Лады" колеру кавы з малаком, пераставіў на ачышчаную пляцоўку. Пагаманілі трохі з Валянцінам і пайшлі на абед. Тады я пісаў свой трэці раман "Дзікая ружа". Праца рухалася цяжка, нібы па смале, галава — поўная сумненняў. Калі не ездзіў у выдавецтва, то сядзеў за сталом па дзесяць-дванаццаць гадзін. Рэдка выходзіў на вуліцу. З Валянцінам бачыліся мімаходзь у сталоўцы. Ён таксама шчыраваў за пісьмовым сталом. Адночы ён прапанаваў пасля вячэры пахадзіць па лесе.

Вечар быў ціхі, светлы, з лёгкім марозікам. Лёгка дыхалася, хораша думалася. Мы выбраліся на шашу і пакіравалі ў бок Ракава. Машын было мала, мы крочылі амаль па сярэдзіне дарогі, смела і раскавана гаманілі пра жыццё-быццё. Валянцін узгадаў, што некалі працаваў у Ракаве, што перабраўся сюды, бліжэй да сталіцы, бо намыжыўся паступіць у аспірантуру. А першыя гады працаваў на Браслаўшчыне, спярша настаўнічаў у мястэчку Іказнь, а потым быў завучам у Барадзінічах.

— Разумееш, Лявоне, Браслаўшчына вельмі ўразіла мяне. І не толькі азёрамі, іхняй прыгажосцю. Уразіла гісторыяй, беларускасцю. Да мяне дайшло, што я — выпускнік гісторыка-філалагічнага факультэта, не ведаю гісторыі роднага краю, не ведаю дыялектаў нашай мовы. І мне зрабілася сорамна за мае рускія вершыкі, якія крэмзаў у студэнцкія гады. Я ж зямляк вялікага Кузьмы Чорнага.

— А я — зямляк вялікага паэта Аркадзя Куляшова, а таксама пачынаў пісаць па-руску. Першае апавяданне надрукаваў у "Советской Белоруссии". Першыя сур'ёзныя нарысы — у часопісе "Неман".

— Ведаю. Твой "Беларскі мёд" я чытаў у "Немане". Яшчэ пад тваім "дзявочым" прозвішчам. Я спярша падумаў, што гэта маскоўскі Леанід Лявонаў напісаў пра наш мёд. Дык вось, чаму так адбываецца? Таму, што ў школе, на філфаках нават адвучваюць ад роднай мовы.

Наперадзе засвяціліся агні першых дамоў мястэчка.

— Ну што, у Ракаў не пойдзем? Самагонкі шукаць не будзем? — Валянцін паярнуўся да мяне, спыніўся.

— Не будзем. Адкладзем гэта да лепшых часоў.

— Згодзен. Баюся, каб не сарвацца. Трохі ўцягнуўся ў работу.

Мы павярнулі назад. Мне заманулася спытаць у Валянціна пра гісторыю яго звальнення з акадэміі, пра ягоных сяброў, бо разумеў, што лепшага моманту для такой гаворкі можа і не надарыцца. Валянцін доўга маўчаў, потым уздыхнуў, сумна прамовіў:

— Давай і гэту гаворку адкладзем. Каб не сыпаць соль на рану. А то давядзецца будзіць цябе ноччу, каб наліў кілішак. Дый не адзін...

Ідучы назад, гаварылі пра літаратуру, прыказкі, прымаўкі, якія стварыў народ.

— Вось глядзі, мае Аксаміты на Капыльшчыне, Ракаў, Браслаўшчына, Барадзінічы, Іказнь, дзе я працаваў. Гэтыя паселішчы аддзяляюць сотні кіламетраў. А прыказкі і прымаўкі мала адрозніваюцца. Вядома, ёсць асаблівасці. І гэта натуральна. Запісваць іх пачаў у роднай вёсцы, а потым — на Браслаўшчыне. І тут, у Ракаве...

Наша вячэрняя прахадка з Рабкевічам апісана ў маім дзённіку, але канкрэтных прымавак і прыказак я не знайшоў. У Валянціна ёсць цэлая кніга прыказак і прымавак, якая называецца "Паслухай, што людзі кажуць", але пра не, пра ягоныя вершы і пераклады гаворка наперадзе.

Займеўшы машыну, я завёў пчол, потым курэй, ката, сабаку. А гэта ўжо гаспадарка. А як выдавалася вольная хвіліна, імчаў на лецішча. Праз нейкі час я пачаў і зімаваць у лясной вёсачцы Пятрылава на Вілейшчыне. А Валянцін вольнаю хвілінаю ляцеў у родныя Аксаміты. Таму бачыліся мы рэдка.

Неяк на планёрцы пачуў, што Валянцін хварэе, але працуе дома. Напрыканцы дня, калі быў я ў пакоі адзін, патэлефанаваў яму. У трубцы пачуўся хрыплы, зусім незнаёмы голас. Тон яго змяніўся, палагаднеў, калі гаспадар пазнаў мяне:

— Хварэю, Лявоне. Так што выбачай, суразмоўнік я сёння кепскі.

— Можа, якія лекі прывезці?

— Не, не трэба. Пакрысе ачухаюся. Дні праз два-тры буду ў выдавецтве. Просьба да цябе: не кажы нікому, што гаварыў са мною. І што голас мой не дужа звонкі. Ну, каб не абмывалі языкамі...

— Добра. Будзе па-твойму. Ну, мацуйся! Да сустрэчы!

У слухаўцы пачуліся кароткія гудкі. Міжволі падумалася: пэўна, Валянцін ашчаперыў галаву дрыжачымі рукамі, і, каб не зваліць ад скрухі ды роспачы, узяў за горлечка чарговую пляшку.

А потым пачаліся іншыя хваробы. Усё часцей Валянцін трапляў у бальніцу.

## V

І вось надышоў той чорны марозлівы лютаўскі дзень 1995-га. Мы ехалі на Капыльшчыну заказным аўтобусам. У зачыненай труне везлі дамоў Валянціна Рабкевіча. Да труны ціснуліся, нібы яна прыцягвала іх як магніт, вянкі з чорнымі жалобнымі стужкамі. Мы — гэта Ліна Карус, якая загадвала рэдакцыяй прозы, Іван Канановіч, Алесь Рыбак, аўтар гэтых радкоў, удава нябожчыка Ванда Мартынаўна, яго дзеці — два сыны.

Ехалі моўчкі. На дварэ ціснуў лютаўскі мароз. Дарогі завалія снегам. Аўтобус з цяжкасцю прабіўся да Аксамітаў.

Труну ўстанавілі ў хаце. Я выйшаў на двор. Мне хацелася ўбачыць лазню, пра якую апавядаў мінулаю восенню Валянцін:

— Канчаю лазню. Ужо й печку ўстанавіў. Венікаў навязаў. Каменя засталося прывезці. Вагонкаю абабіць сцены. Матэрыял ёсць. Усё ёсць. Адно бракуе часу. Дый здароўе падводзіць. Неяк дацягну да пенсіі, паеду ў вёску. Пачну новае жыццё... Слухай, хачу папагыца. Якое камянне лепей для лазні? Недзе чытаў, што рэкамендуюць рачное.

— Ну так, яно самае чыстае. Без аніякіх пахаў. Белых не бяры. Лепей цямнейшых, шэрыя, чырвоныя.

— Наконт белых гэта цікава. Канешне, яны могуць замурзацца, — Валянцін памаўчаў, зацягнуўся цыгарэтаю. — Лазня — гэта чысцілішча для душы і цела. Нездарма людзі кажуць: лазня вылечыць кожнага, абы змог да яе дайсці. Так што вазьмуся збіраць камяні. Між іншым, вельмі люблю камяні. Гэта вечная прыгажосць. Першародная. Японцы мудрыя, любяць сады з камянёў. Дрэва вырасла, усохла. Вецер зламаў. Карэды патачылі. А камень — гэта вечнасць...

Ці думаў тады Валянцін Рабкевіч, што яму заставалася жыць паўгода?

Згадка пра нашу апошнюю гутарку прамільгнула за нейкае імгненне.

А вось і Валянцінава лазня. Яна прытулілася за невялікай пуняй. Замка на дзвярах не было. Увайшоў. Пачуў невынішчальны водар свежых сасновых дошак. У вочы кінулася вагонка, акуратна складзеная ў прымыльніку. Вось і чыгунная печка, напалову запоўненая каменнем. Сцяна над палком прыгожа абабіта кароткімі дошчачкамі. Бярвёны каля дзвярэй былі голыя, у пазах тырчаў бела-зялёны мох.

Я стаяў нібы ўкапаны. Выгляд недабудаванай лазні ашаламіў мяне. Як стараннліва ўсё рабіў чалавек! Як марыў папарыцца на гэтым палку гарачым духмяным бярозавым венікам! Спярша адхвастаць венікам сыноў, каб здаровымі былі, потым ашчадна, лагодна папарыць жонку. І радасць гэтая была так блізка!

Не даведзеная да ладу лазня Валянціна Рабкевіча падалася мне сімвалам трагізму чалавечага жыцця. Кожнага чалавечага жыцця, бо кожны, каго нарадзіла маці, павінен памерці. А жыццё Валянціна было скалечана ў самым росквіце.

Між тым у хаце збіраліся вяскоўцы. Сталага веку кабета ў чорнай плюшаўцы галасіла над трунай: "А даражэнькі ж наш Валічак, а куды ж гэтак рана сабраўся? А табе ж бы яшчэ жыць ды жыць, дзетак гадаваць, унукамі потым цешыцца... А хатачка ж твая бязвокная..."

На двары тоўпіліся сцішаныя, зажураныя мужчыны. З усіх бакоў вёскі ішлі людзі. Апоўдні труну вынеслі з хаты. Мужчыны ўзнялі яе на рукі і панеслі праз усю вёску.

Каля дамоў Валянцінавых родзічаў сталі ўслоны, засланыя белымі абрусамі. На ўслоны асцярожна апускалі дамавіну, каб нябожчык развітаўся з хатамі сваякоў. У гэтым звычаі — спрадвечная мудрасць: Ён заходзіў сюды пры жыцці, тут Яго памятаюць. Ён павінен развітацца...

Мужчыны неслі труну і за вёскаю яшчэ ладную вярсту, аж да самых могілак. Мы неслі ўслед вянкі. Уся вёска праводзіла ў апошні шлях свайго слыннага земляка.

— Няўжо нельга было запрэгчы каня? — пачуўся сцішаны дзявочы галасок.

— Гэткіх людзей, як наш Валянцін Іванавіч, трэба насіць на руках, — прагучаў у адказ хрыплаваты мужчынскі голас.

Дзень выдаўся сонечны, светлы, бліскучы і пераліваўся ўсімі колерамі вясёлкі чысты зіхоткі снег. Раптам на сонечны дыск насунула бухматае фіялетава-попельнае воблака, запырхалі буйныя сняжынкі. Яны ціхутка апускаліся на твар, на высокі лоб нябожчыка. Падалі ды не раставалі.

Сняжынкі падаліся мне чорнымі.

У Мінск мы вярнуліся, калі ўжо ацямнела. У прасторнай сталоўцы чыгуначнага вучылішча, дзе працавала Ванда Мартынаўна Рабкевіч, ладзілася развітальная, жалобная вячэра. Падымаліся людзі, казалі прачулыя словы. Выступы калег Ванды Мартынаўны ўразілі: аказваецца, яны ведалі Валянціна не толькі як мужа, бацьку, але і як навукоўца, пісьменніка. Яны разумелі, каго страціла Беларусь.

## VI

Улетку 1999-га мяне запрасіла на радыё Галіна Шаблінская, каб запісаць перадачу пра маю кнігу "Ларыса, альбо Прыгоды аўтамабіліста". Шаблінская робіць выдатныя праграмы, якія вылучаюцца глыбокім веданнем нашай літаратуры. Галіна Васілеўна ўмее разгаварыць суразмоўцу, таму гутаркі з ёй няязмушаныя, раскаваныя, цікавыя для слухача. Было і такое пытанне: ці ёсць прататып галоўнага героя аповесці? Я адказаў: адзін з прататыпаў — Валянцін Рабкевіч.

Праз нейкі час патэлефанавала незнаёмая жанчына: яе зацікавіла перадача, яна сябравала з Валянцінам у студэнцкія гады, была разам з ім на цаліне, захоўвае фотаздымкі тых гадоў, верш, які Валянцін прысвяціў ёй.

І вось я трымаю пажаўцелы аркуш паперы, на ім прыгожыя, акуратныя радкі — почырк будучага настаўніка-філолага. Верш на рускай мове. Аўтар прачытаў яго ў застоллі — віншаваў сяброўку з днём нараджэння. У вершы малады паэт параўноўвае дзяўчыну з "цветущей сиренью", жадае ёй вялікага кахання.

Разглядаем фотаздымак, зроблены ў той дзень далёкага 1957-га. Пяцёра хлопцаў, усе ў цёмных гарнітурах, белых кашулях, збоч, кулаку, чатыры дзяўчыны ў даўгаватых сукенках з плечыкамі. Светлыя, сарамлівыя твары. І стаяць яны паасобку: хлопцы — сабе, дзяўчаты — сабе. Ніхто не ўсміхаецца, усе сур'ёзныя, а як жа інакш — здымак для гісторыі.

— Ці пазналі Валянціна? Вось ён. Ужо тады насіў акуляры. А гэта мой будучы муж Уладзімір Прылішч, — апавядае Ірына Аляксандраўна.

А як жа закаханы паэт? Аказваецца, у той вечар сябры-студэнты пагаманілі памужчынску. Не, без мардабою, культурна, па-сяброўску.

— Дарагі Валянцін. Ты напісаў выдатны верш. І прачытаў яго хораша. Ведаю, Ірына падабаецца табе. І мне яна падабаецца. Выбіраць ёй. І яна выбрала мяне. Калі не верыш, спытай у яе.

Уладзімір быў старэйшы за Валянціна гады на два, вучыўся ўжо на апошнім курсе. Болей малады паэт не пісаў Ірыне вершаў. І ўсё ж адну паштоўку — віншаванне з Першамаем Ірына ад яго атрымала. Знайшла яе ў вестыбюлі падінстытута ў паштовай ячэйцы на сваю літару. Паштоўка была без канверта, аўтар, які схаваўся за псеўданімам "В.Аксамитный", пісаў: "Пройдет полгода, и я тебя больше никогда не увижу, но помнить буду всегда". Віншаванне даслаў таму, што Ірына і Уладзімір яшчэ не пабраліся, магчыма, яшчэ на нешта спадзяваўся. Не ведаў, што дата вяселля ўжо была прызначана.

Праз год Ірына нарадзіла двойню — двух сыноў. Уладзімір Прылішч доўгі час працаваў у Міністэрстве культуры. Перажыў ён Рабкевіча на тры гады.

## VII

А цяпер пра тое, што паспеў зрабіць Валянцін Рабкевіч у літаратуры і мовазнаўстве. Хоць пачынаў ён пісаць на рускай мове, але потым перайшоў на родную і выдаў зборнік вершаў для дзяцей "Ад зімы да лета". Я ўжо называў ягоную кнігу прыказак і прымавак "Паслухай, што людзі кажуць". Мяне вельмі зацікавіла аўтарская "Слова да чытача". І вось чаму. Але тут трэба даць слова Рабкевічу: "Прыказкавая паэзія запаланіла мяне яшчэ ў студэнцкія гады, калі выйшла з друку ў 1957 годзе кніга майго настаўніка, прафесара Фёдара Міхайлавіча Янкоўскага "Беларускія народныя прыказкі і прымаўкі". Запаланіла глыбінёю асэнсавання чалавечага жыцця, лаканічнасцю і дасканалаю адшліфаванасцю паэтычнага радка, трапнасцю выказвання. Чытаў гэтую кніжку і перачытваў, многае завучваў на памяць. Вучыла яна жыць, давала ў жыцці накірунак".

Значыць, вось адкуль пачалося захапленне Беларушчынай, вось што дало накірунак у далейшым жыцці.

Гэтая кніга Фёдара Янкоўскага адыграла пэўную ролю і ў маім лёсе. Я працаваў загадчыкам клуба ў родным Касцюковіцкім раёне — аддаленая вёска Гаўрыленка на самай мяжы з Браншчынай. Неяк пачуў з чорнай талеркі-рэпрадуктара, што ў Мінску выйшаў зборнік прыказак Фёдара Янкоўскага і што яго можна заказаць "Кніга-поштай". Мяне, першакурсніка-завочніка журфака БДУ, кніжка не магла не зацікавіць. Тут жа накатаў ліст. І вось напрыканцы снежня 1957-га атрымаў бандэроль, а ў ёй "Беларускія народныя прыказкі і прымаўкі". Чытаў з алоўкам амаль усю доўгую піліпаўскую ноч. Гэтая кніжка, а пазней знаёмства з Фёдарам Янкоўскім, частыя сустрэчы з ім, калі я працаваў у часопісе "Полымя", зрабілі пераварот у маёй душы.

Пра Ф.Янкоўскага я напісаў эсэ "І за гарою пакланюся", таму паўтарацца не буду.

Пачаў Валянцін запісваць прыказкі ў роднай вёсцы Аксаміты на Капыльшчыне, спачатку ад маці, бацькі, затым ад суседзяў. Шмат дала дыялекталагічная практыка ў Калінкавіцкім і Рэчыцкім раёнах. Потым занатоўваў пачутае ў Браслаўскім раёне, дзе працаваў пасля інстытута, пазней — у Ракаве.

Кніжка "Паслухай, што людзі кажуць" убачыла свет у "Мастацкай літаратуры" ў 1985 годзе, мела наклад 5 тысяч — па сённяшнім часе зусім немалы, магла трапіць у бібліятэкі, да шматлікіх аматараў народнага фальклору. Пры кожнай прыказцы падаецца мясціна, дзе яна запісана, размешчаны запісы ў алфавітным парадку.

Гартаю кніжку, натыкнуўся на прыказку: "Памёр — усё гора адпёр". Чуў я іншы варыянт: "Памёр — усе гразі адпёр". Якія грахі меў Валянцін Рабкевіч? Выбіўся з вёскі ў людзі, стаў навукоўцам. Любіў сваіх сыноў, жонку, любіў сваю Радзіму, родную мову. Дык хіба ж гэта грахі? Такія людзі вартыя самай глыбокай павагі і ўдзячнасці. Гэта — стрыжань нацыі. Так ёсць ва ўсім цывілізаваным свеце.

А хіба не варты чытацкай удзячнасці Рабкевіч-перакладчык? На беларускай мове ўбачылі свет у ягоным перакладзе "Жанчына ў пяску" і "Чужы твар" Коба Абэ, "Птушкі на церніях" К.Макклоў, "Тарас Бульба" М.Гогаля, творы Г.Ахматавай, С.Ясеніна, М.Рыльскага.

Неяк у сваёй вясковай бібліятэцы разгарнуў штогадовы літаратурны зборнік "Далягляды" за 1978 год, а ў ім — пераклады Рабкевіча. Але спярша не магу не сказаць добрае слова пра "Далягляды". Вось гэты зборнік за 1978 год. Якія аўтары: Леў Талстой і Фрыдрых Шылер, Чынгіз Айтматаў і Барыс Алейнік, Андрыс Веян і Нгуен Нгок, Ганна Ахматава і Віслава Шымборская! А якія перакладчыкі: Янка Брыль, Ніл Гілевіч, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Ніна Мацяш, Васіль Сёмуха! У гэтай самавітай кампаніі ёсць і Рабкевіч. "Далягляды" мелі 10 тысяч наклад, траплялі амаль у кожную бібліятэку. Гэта было вялікае дасягненне: на беларускай мове загаварылі пісьменнікі ўсяго свету. Хросным бацькам альманаха, яго галоўным рэдактарам быў Ніл Гілевіч. Разам з ім змагаўся за выданне Міхась Дубянецкі. Нязменны ўкладальнік — Аляксей Гардзіцкі, рэдактар — Васіль Сёмуха. Увогуле дзейнасць выдавецтва "Мастацкая літаратура" ад яго стварэння ў 1972-м да 1991-га, іншых выдавецтваў рэспублікі — гэта залаты час беларускага кнігавыдання.

У "Даляглядах" за 1978 год Рабкевіч друкуе пераклады Ахматавай. Я чытаў іх цяпер і дзівіўся, як арганічна, натуральна гучаць па-беларуску творы вялікай паэтэсы. Працытую цалкам верш "Музыка":

У ёй штосьць цудадзейнае гарыць,
Уся яна так дзіўна праменіцца,
Ідзе сама са мной пагаварыць
І суцяшаць душу мне не баіцца.
Вачэй пагляд з даверам і дабром,
І грозны за плячыма бляск ускрыллю...
І гэта ўсё — нібыта першы гром
Ці быццам кветкі ўсе загаварылі.

Так, паспеў зрабіць Валянцін Рабкевіч нямала. Але колькі б ён мог напісаць мовазнаўчых прац, а можа, і зборнікаў паэзіі, каб не падрэзалі крылы на самым узлёце!

## VIII

Студзеньскім калядным вечарам мая жонка Рагнеда вярнулася з Мінска і кажа:

— Прывітанне табе ад Ірыны Дарашкевіч. Цікавая была сустрэча. Выходжу з пад'езда, насустрач — Ірына. Павіталіся. Яна й пытаецца: "Ці можна купіць у вас мёду?" Я кажу: можна, пакуль яшчэ ёсць. "Гэта ж я была ў сваёй вёсцы на Віцебшчыне, — апавядае Ірына далей. — Маці кажа: "Там у вас, у Мінску, жыве пісьменнік-пчаляр. Вось ён у "Гаспадыні" піша, што ў яго дужа смачны мёд. Можа б, ты патэлефанавала ў рэдакцыю, даведалася, як яго знайсці. Во, тут і здымак ёсць". Я зірнула на здымак: "Вой, дык я ж яго ведаю! Жыве ў нашым пад'ездзе". — "Няўжо? — здзівілася маці. — Дык і шукаць табе лёгка. Купі ў яго мядку". Маці за часопіс — і да суседзяў. Уся вёска дзівілася...

Слухаў я жончын аповед, нават заўсміхаўся, але міжволі згадаўся трагічны лёс Віктара Дарашкевіча, апантанага навукоўца, які адкрыў нам Міколу Гусоўскага, і на душы зрабілася вельмі сумна.

Ноччу прысніўся сон. Сяджу за сваім сталом у "Мастацкай літаратуры" на дзявятым паверсе Дома кнігі. Уваходзіць Валянцін Рабкевіч, як заўсёды, моцна ціснe маю руку, а сам вясёлы, шчаслівы, цёмна-карыя вочы гарэзліва паблісківаюць з-пад акуляраў.

— Ну, можаш мяне павіншаваць. У суботу адбылося адкрыццё лазні. Праўда, не афіцыйнае.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

## Лёс Валянціна Рабкевіча

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

— Што значыць — не афіцыйнае?

— Пакуль што без сяброў. Пасямейнаму. Папарыўся з сынамі. Адхвастаў іх гарачым венікам. Потым яны мяне. Спярша — старэйшы, а тады — малодшы. Адправіў іх дамоў. Прыйшла жонка. З ёй папарыліся. Любата! Венікаў навязаў, як ты раіў: бяроза, дуб, палын... Дык вось, ёсць прапанова. Давай у наступную суботу да мяне. Я патэлефаную Віктару Дарашкевічу. Возьмеш яго. А на вуліцы Цікоцкага... Гэта ж побач з тваім Лагойскім трактам жыве Алесь Каўрус. І яго забярэш. І катанем у мае Аксаміты. Лепей ранічкай. Натопім лазню як мае быць. І будзе ў нас свята душы і цела.

— Прапанова цікавая. Але я не закончыў рамонт машыны. Ланжэрон трэба заварыць. Паржавеў.

— Ланжэрон — штука сур'ёзная. На ім кузаў трымаецца, — спахмурнеў Валянцін. — Тады зробім так. Хлопцы мае паедуць аўтобусам. А я з Вандай і вас трое — уціснемся...

На гэтым я прачнуўся. За вокнамі хаты скуголіў, нібы галодны сабака, вецер. Вось як адгукнулася ўчарашняя згадка пра Віктара Дарашкевіча — прысніўся сон. А яшчэ падумалася: можа, душа Валянціна Рабкевіча нагадвае, што я не скончыў эсэ, пачатае пасля паездкі ў Ракаў? І што 70-гадовы юбілей — нарадзіўся Валянцін Іванавіч 15 лютага 1937 года — фактычна не быў заўважаны, не быў адзначаны належным чынам.

Спаць болей не хацелася. Падняўся сярод ночы і сеў за стол.

Так і нарадзіліся гэтыя згадкі пра выдатнага Беларуса Валянціна Рабкевіча.

**РЭГІЁН**

## Фэст байкераў скончыўся рэанімацыяй

Падчас байк-фэсту "Хавайся ў бульбу" ў Гродне адбыліся чатыры аварыі. Ахвяра адной з іх патрапіла ў рэанімацыю.

Чацвёрты Міжнародны байк-фэст "Хавайся ў бульбу" праходзіў у Гродне ў мінулыя выхадныя. У ім бралі ўдзел каля тысячы байкераў з сямі краін. Аднак само правядзенне фэсту і рух матацыклістаў па Гродне сталіся прычынай чатырох аварый у абласным цэнтры.

Самай жорсткай аварыяй стала здарэнне каля гродзенскага рынку "Карона". Байкер з Масквы на вялікай хуткасці ўляцеў у слуп асвятлення. "Хуткая" забрала хлопца ў шпіталь, дзе ён знаходзіцца зараз у аддзяленні рэанімацыі.

**БРУСЕЛЬ—МІНСК**

# Супраціўленне агню

*100-працэнтным даверам у насельніцта Бельгіі карыстаюцца пажарныя. Як яны жывуць, як працуюць, колькі зарабляюць, як бавяць вольны час, высвятляў наш карэспандэнт у Бруселі.*

Пажарная часць вёскі з даволі цяжка вымаўляемай назвай Хэйст-оп-дэн-Берг, што ў 20-ці кіламетрах ад Антверпена, "уціснулася" паміж дзвюма прыватнымі віламі. Адразу і не здагадаешся, што будынкі займае звычайная пажарная служба. Здаецца, гэта офісныя памяшканні нейкай багатай фірмы: уходжаныя, пакрытыя свежай фарбай будынкі, роўненькі, нібы вымыты з мылам асфальт, сучасная прыёмная з вялікім, мільгаючым лямпачкамі пультам. І толькі некалькі музейных экспанатаў чырвонага колеру на вуліцы, сярод якіх — старая пажарная помпа гадоў гэтак трыццатых-саракавых ды вялікі надпіс на будынку "Brandweer", што ў перакладзе з нідэрландскай мовы дослоўна азначае "супраціўленне агню", — даюць карэспандэнту зразумець, што прыйшоў ён па адрасе.

Мяне чакалі. Пажарны з 18-гадовым стажам, чалавек з даволі дзіўным прозвішчам — **Франс Вранкс** — сустрэў мяне ўсмешкай. Каб фотаздымак для "Народнай волі" атрымаўся больш якасным, ён спецыяльна выгнаў з ангара на вуліцу вялікі пажарны "мерседэс". А потым, калі здымак быў гатовы, нечакана запытаўся: "Можа, яшчэ якую машыну выгнаць?.."

### Пажарным — 100% даверу!

Згодна з бельгійскай статыстыкай, менавіта гэтай прафесіі больш за ўсё давярае насельніцтва. Амаль кожны мясцовы жыхар ставіць яе на першае месца. У тройку прызёраў таксама ўвайшлі прафесіі доктара і настаўніка.

Пажарны — сапраўды небяспечная, але вельмі паважаная прафесія. І не толькі ў Бельгіі, але, думаю, наогул у свеце.

Мой суразмоўца **Гій Ван дэ Хаар**, дырэктар прафсаюза пажарных Фландрыі *(паўночная частка Бельгіі. —* **А.С.***)*, знаходзіць адзін з сакрэтаў гэтай папулярнасці ў тым, што *"момант бяды, небяспекі, які выпадае хоць раз у жыцці, кожны чалавек запамінае. І застаецца ўдзячны тым, хто аказаў яму дапамогу"*. Другі матыў, згодна з Гіем, ляжыць у самой сістэме тушэння пажараў у Бельгіі: большасць пажарных складаюць так званыя добраахвотнікі, сярод якіх многа звычайных жыхароў, іх суседзяў, сваякоў, сяброў. *"Моцная сувязь паміж "кліентамі" і намі, бакі ва ўсіх сэнсах размаўляюць на адной мове"*, — кажа Гій.

Пажарны Франс дадае, што "кліенты" ў большасці сваёй ўспрымаюць яго і яго калег як *"сапраўдных мужчын, смелых, самаадданых, самаахвярных"*.

### Ці лёгка стаць прафесійным пажарным?

Каб пачаць навучанне ў спецыяльнай школе пажарных, трэба прайсці медагляд, паспяхова здаць спартыўны і тэарэтычны экзамены. Колькасць месц у гэтай школе, дарэчы, абмежавана і залежыць ад колькасці існуючых працоўных вакансій.

Курс навучання цягнецца год, і курсантаў вучаць не толькі непасрэдна прафесіі, але і таму, напрыклад, як аказаць першую медыцынскую дапамогу, "стабілізаваць стан здароўя ахвяры, каб бяспечна даставіць яе ў шпіталь". Усім выпускнікам школы абавязкова выдаецца акрамя асноўнага яшчэ і сертыфікат медбрата. "Разнастайнасць" — гэта, дарэчы, адна з галоўных прычын, чаму Франс Вранкс выбраў менавіта гэтую прафесію...

Пазней, у працэсе працаўладкавання маладога пажарнага, перавага ў любым выпадку аддаецца кандыдату, які не толькі скончыў пажарную школу, але і пэўную колькасць гадоў "адпрацаваў на пажарную каманду на добраахвотнай аснове".

Спачатку паспяховы кандыдат атрымлівае ўсяго толькі кантракт стажора, і толькі праз пэўны выпрабавальны тэрмін — "vast-contract" ці кантракт пастаянны.

У пажарнай ахове Бельгіі гэтаксама, як і ў арміі, існуюць вайсковыя званні, і таму кожны пажарны, у прынцыпе, робіць вайсковую кар'еру.

### Мова лічбаў

У 6-мільённай Фландрыі каля 120 пажарных казармаў. Кожная забяспечана неабходнай колькасцю спецыялізаваных пажарных грузавікоў і машын хуткай дапамогі. У ангары пажарнай часці вёскі Хэйст-оп-дэн-Берг, напрыклад, я налічыў не менш за 15 адзінак. У асноўным гэта тэхніка маркі "мерседэс". *"Наша прафесія — самая паважаная, самая надзейная, і таму мы павінны ездзіць на самых надзейных аўтамабілях"*, — смяецца Франс Вранкс. І дадае: *"У нас тут пад бокам тэхнічны сэрвіс гэтай кампаніі, вельмі зручна"*.

У раёне, у якім пражывае 45 тысяч насельніцтва і які абслугоўвае адна, невялічкая пажарная часць, у год адбываецца 60—100 пажараў. Асноўныя прычыны — гульня с запалкамі, неахайнасць, няпамятлівасць. Як і паўсюль у свеце...

Калі нейкі бюргер, убачыўшы пажар, тэлефануе па універсальным нумары 100 (аналаг амерыканскага 911 — пажарныя, "хуткая дапамога", паліцыя), гэты выклік аўтаматычна паступае на цэнтральны пульт. Адразу ж, у лічаныя секунды, ён пераадрасоўваецца да бліжэйшай да месца пажару часці. Нарматыў прыбыцця пажарнікаў на месца — 5—7 хвілін. Не болей.

Кожны дзень у пажарную часць Бельгіі паступае ў сярэднім 3—4 выклікі. Гэта не толькі выклікі непасрэдна на пажары. Часам трэба выцягнуць чалавека з уласнага аўто пасля аварыі, дастаць ката з дрэва альбо проста аказаць медыцынскую дапамогу ці даставіць хворага ў шпіталь. Згодна са словамі сп.Ван дэ Хаара, 70% машын хуткай дапамогі ў краіне належаць пажарным.

Усяго ў Фландрыі працуюць 11 тысяч пажарных, сярод якіх прыкладна трэць — штатныя, астатнія — добраахвотнікі.

### Хто такія добраахвотнікі?

Гэта звычайныя паштальёны, адміністрацыйныя супрацоўнікі, гандляры, шафёры, якія падпісваюць спецыяльны кантракт з мясцовай пажарнай аховай. Свой дазвольны подпіс на кантракце павінен паставіць таксама і працадаўца добраахвотніка.

Дарэчы, у майго суразмоўцы Франса ў той час, калі ён працаваў добраахвотнікам, быў свой невялічкі бізнес — газетны кіёск...

Згодна з вышэйзгаданым кантрактам, у пэўны момант, калі на спецрацыю добраахвотніка паступае сігнал небяспекі — так званы "біп-тон", ён павінен тэрмінова прыбыць у казарму. Звычайна, на ўласным аўто... І там, у казарме, ён надзявае спецыяльную форму і з другой партыяй (першымі адбылі штатныя пажарныя, якія пастаянна знаходзяцца на дзяжурстве) адпраўляецца працаваць — тушыць пажар.

На месцы добраахвотнік вонкава нічым не адрозніваецца ад звычайнага пажарнага, і атрымлівае, дарэчы, роўны з ім ганарар. *"Часам прыходзіцца выклікаць добраахвотніка ў нядзелю, ноччу, падчас святаў, даставаць яго з ванны, з уласнага агарода,* — дзеліцца прафсаюзнік Гій. — *Але што ж тут зробіш — на тое ён і добраахвотнік, усё робіць па добрай волі"*.

Франс Вранкс каля свайго "лімузіна".

Музейны экспанат.

### Суровы свет мужчын

Больш за 99% пажарных Бельгіі — мужчыны. Жанчыны, калі і занятыя ў "брандвэры", то выключна на адміністрацыйнай працы альбо ў якасці медсясцёр. *"Прычына тут простая,* — кажа Гій, — *жанчыны элементарна не здаюць спартыўны тэст, іх цела інакш пабудавана..."*

Тым не менш жанчын больш вітаюць, напрыклад, пры прыёме на працу ў "брандвэр" па суправаджэнні параненых. Ды і увагай прэсы яны забяспечаны на ўсё жыццё. Адна з самых вядомых пажарных Бельгіі Карын Веркалстэрэн неяк сказала ў інтэрв'ю, што *"жанчына не становіцца менш жанчынай, калі працуе ў пажарнай ахове"*.

Іншая прычына даволі жорсткага гендэрнага падыходу да падбору супрацоўнікаў — вялікая рызыка атрымання прафесійнага захворвання, траўмы, апёку альбо інваліднасці. Прычым, што цікава, большасць траўм бельгійскія пажарныя атрымліваюць падчас тэстаў і трэніровак, а не падчас рэальнай працы.

Як фінансава абаронены пажарны ў такім выпадку? Згодна са сп. Ван дэ Хаарам, *"у кантракце падрабязна абумоўлена неабходная страхоўка, акрамя звычайных страхавых кампаній, мы звяртаемся і да фондаў салідарнасці, якія арганізоўваюцца мясцовымі ўладамі. Гэтых грошай хапае на неабходнае лячэнне, пратэзіраванне, пенсію"*.

У сярэднім 2—3 пажарных у год гінуць на месцы працы. У гэтым выпадку сям'я загінуўшага забяспечваецца адпаведнай пенсіяй.

### Ціхі пратэст

Нядаўна адну з пажарных казарм Антверпена наведаў мясцовы бургамістр Патрык Янсенс (дарэчы, вельмі папулярны палітык). Яму вельмі не спадабалася афіша з выглядам голай прыгажуні, якая красавалася на сцяне казармы. *"У пажарнай ахове таксама працуюць і жанчыны, трэба з павагай ставіцца да іх"*, — рэзюмаваў палітык, загадаўшы зняць крамолу і надалей штрафаваць за падобныя вольнасці.

Як сцвярджае мясцовая прэса, пажарнае начальства *"з разуменнем аднеслася да ініцыятывы бургамістра"*. А вось звычайныя пажарныя прынялі яе, як кажуць, "у штыкі". У знак, відаць, ціхага пратэсту яны папрасілі адзін папулярны штотыднёвік надрукаваць серыю адпаведных, яшчэ больш інтымных постэраў. Эксклюзіўна для пажарных! Штотыднёвік аднёсся да гэтай ініцыятывы з энтузіязмам і, у рэшце рэшт, не прагадаў: на сённяшні дзень амаль усе пажарныя казармы Бельгіі пацвердзілі заказ на гэты постэр.

Іншы раз любому палітыку ў гэтай краіне, нават вельмі папулярнаму, трэба больш абдумана ставіцца да сваіх загадаў. Інакш аднойчы ад гэтай папулярнасці можа застацца толькі дым...

### 2000 еўра ў месяц. Плюс прэміяльныя

Стаўкі заробкаў для штатных пажарных і добраахвотнікаў адноўкавыя — 10 еўра ў гадзіну. Розніца ў тым, што "штатнікі" зарабляюць грошы таксама і ў рэжыме чакання, атрымліваючы пастаянную зарплату — у месяц недзе 2000 "мінус падаходны". Добраахвотнікам жа ганарар налічваецца выключна падчас акцыі. І залічваецца ім як мінімум дзве гадзіны за кожны выклік. Калі добраахвотнік падпрацоўвае на тушэнні пажараў не больш, чым на 3000 еўра ў год, падаткі з гэтай сумы ён не плаціць.

За працу ноччу існуе 50-працэнтная надбаўка, у суботу і нядзелю — 100-працэнтная.

Чым жа займаюцца "штатнікі" ў рэжыме чакання, чым бавяць вольны час? *"Раней,* — сцвярджае Гій Ван дэ Хаар, — *існаваў стэрэатып, што пажарныя ў вольны час гуляюць у карты і п'юць піва. Цяпер мы не можам дазволіць сабе такіх уцех, вольнага часу амаль няма. Шмат выклікаў па медыцынскіх прычынах, потым трэба пастаянна абнаўляць веды, трэніравацца, ды і да параду рыхтавацца..."*

Раз у год, у верасні, на свята святой Барбары ўсе пажарныя Бельгіі ладзяць у сваіх гарадках святочныя парады — дэманструюць усю спецтэхніку, самі ўрачыста апранаюцца. *"Гэта наша своеасаблівая справаздача перад падаткаплацельшчыкамі"*, — кажа Гій.

Франс таксама любіць такія святы, таму што яго шчыра вітаюць сябры і суседзі, нават жонка з 18-гадовай дачкой прыходзіць: *"Звычайна яны не вельмі задаволены маім выбарам прафесіі, яны лічаць, што я занадта мала бываю дома"*.

Дарэчы, свой дом Франс, як і многія іншыя бельгійцы, пабудаваў сам. Падчас адпачынку разам з сям'ёй ён любіць наведваць Іспанію альбо Італію...

### "Біп-Біп-Біп!"

Гэта гучыць спецыяльная выкліковая рацыя на поясе Франса. Не паспеўшы адказаць на пару-тройку маіх пытанняў, але папрасіўшы прабачэння за незавершаную гутарку, пажарны раптам зрываецца з месца. Усё зразумела: чарговы выклік! Удакладніўшы па рацыі дэталі, мой суразмоўца хутка накіроўваецца ў бок машыны хуткай дапамогі — на гэты раз камусьці патрэбны яго навыкі медыцынскага брата.

"Dag, Frans! Tot ziens en veel geluk! — Пакуль, Франс! Да пабачэння і ўдачы!.."

**Алесь СІЛІЧ,**
**спецыяльна для "Народнай волі".**
**Фота аўтара.**

*Бельгія.*

### ІНФАРМАЦЫЯ Ў ТЭМУ

**Днямі бельгійскія пажарныя правялі незвычайную акцыю пратэсту пад назвай "голыя ягадзіцы". На адну з цэнтральных плошчаў Антверпена выйшлі больш за дзве сотні прафесіяналаў "супраціўлення агню" ў форме. У адзін момант яны ўсе па камандзе нахіліліся да зямлі і нечакана… агалілі свае задніцы. Так і стаялі хвілін 15, патрабуючы тым самым ва ўрада падняць пенсіі пажарным, а таксама заробкі па суботах і нядзелях. Акцыя трансліравалася па вядучых бельгійскіх тэлеканалах.**

**ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ**

# З «Народнай воляй» — у другое паўгоддзе!

0402280179
**ИЗВЕЩЕНИЕ**

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Предоплата за апрель, май, июнь, июль | | | | |
| август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь | | | | |
| 2008 г. *(ненужное зачеркнуть)* | | | | |
| Плательщик | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Предоплата за апрель, май, июнь, июль | | | | |
| август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь | | | | |
| 2008 г. *(ненужное зачеркнуть)* | | | | |
| Плательщик | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

**КВИТАНЦИЯ**

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операций по уплате налогов.

## Абонентская карточка

*на номера газеты «Народная воля»*
**за апрель, май, июнь, июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г.**
*(ненужное зачеркнуть)*

*Заполняется отчетливо* ***печатными буквами*** *и обязательно отправляется в редакцию с* ***копией платежного документа***

**фамилия**

**имя** **отч.**

**индекс почтового отделения**

**область**

**район**

**название населенного пункта**

*город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)*

**улица**
**пр-т**
**переулок** *(нужное — подчеркнуть)*

**дом** *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

*(Примечание: если можете — укажите, пожалуйста, код подъезда или номер дом.телефона; в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)*

Вы хочаце чытаць "Народную волю" ў другім паўгоддзі? Калі так, то няма праблем! Не адкладваючы, Вы ўжо сёння можаце зрабіць **перадаплату** за нумары, якія будуць выходзіць у ліпені—снежні. Для гэтага Вам толькі трэба тэрмінова завітаць у любы філіял "Беларусбанка" альбо ў любое паштовае аддзяленне і запоўніць бланк, узор якога мы друкуем сёння спецыяльна для Вас.

Мінчане могуць аператыўна зрабіць перадаплату таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: **328-63-93** ці **328-68-71**. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць перадаплату за любы тэрмін. Не маеце магчымасці аплаціць за ўсе нумары другога паўгоддзя — зрабіце гэта за месяц, два, тры...

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па перадаплаце ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіўся, то выгадна рабіць **перадаплату**, з тым каб газета дастаўлялася дахаты.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

**УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.**

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

**Вы — з "Народнай воляй", "Народная воля" — з Вамі!**

**Адрас рэдакцыі:**
**220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.**
**Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.**
**Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906**
**E-mail : nv@promedia.by**
**http://www.nv-online.info**

**Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ**

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 30.04.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №